Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 ЧЭРВЕНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 109 (27967) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Для Магілёўшчыны стварылі ўмовы

СТАР. 2

Baku 2015
1st EUROPEAN GAMES

Першая Еўрапейская алімпіяда

СТАР. 5

Сямейная газета



Кобрынскія трайняты... праз 17 гадоў

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Прадпрыемствы, на якіх працуюць інваліды, маюць патрэбу ў дзяржаўнай падтрымцы. На сённяшні дзень у такіх прадпрыемстваў ёсць пэўныя прэферэнцыі. Але ў той жа час ёсць пытанні з рэалізацыяй прадукцыі, якая выпускаецца, пашырэннем асартыменту, пошукам новых рынкаў збыту, вытворчай кааперацыяй. І ў гэтых пытаннях дзяржава і мясцовыя органы ўлады таксама павінны падставіць плячо, таму што гэтыя прадпрыемствы нясуць істотную сацыяльную нагрузку. Урад і надалей будзе аказваць падтрымку гэтым прадпрыемствам. У тым ліку гэта тычыцца канкурэнтнай перавагі пры правядзенні тэндараў на пастаўку ім прадукцыі, прыярытэтнасці ў разліках і шэрагу іншых».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.06.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15353,00 | ▼ |
| Еўра | 17380,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 280,97 | ▲ |
| Укр. грыўня | 728,49 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# НА ДОСВІТКУ ЛЕТА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Фінансавы выдатнік

## ЖЫЛЛЁ Ў КРЭДЫТ

### Працэнтная стаўка прымальная, але не зафіксаваная

**З гэтага панядзелка Белаграпрамбанк аднавіў прадастаўленне крэдытаў на будаўніцтва індывідуальных жылых дамоў (кватэр), набыццё жыллёвых аблігацый, індывідуальных жылых дамоў і кватэр. Доўгатэрміновы крэдыт выдаецца ў беларускіх рублях пад 39% гадавых. Гэта даволі сур'ёзная заяўка ў сферы фінансавання нерухомасці. Няўжо цяпер у нас з'явілася рэальная магчымасць атрымліваць даступныя крэдыты на жыллё на агульных падставах? Паспрабуем разгледзець усе плюсы і мінусы гэтай прапановы.**

#### 500 МЛН НА 20 ГАДОЎ

Галоўным плюсам гэтага крэдыту з'яўляецца яго сур'ёзны тэрмін, які складае да 20 гадоў. Ажыццяўленне плацяжоў па крэдыце (вяртанне асноўнага доўгу) робіцца штомесяц роўнымі часткамі. Магчыма прадастаўленне адтэрміноўкі пачатку пагашэння плацяжу па крэдыце (вяртанне асноўнага доўгу) на тэрмін да 1,5 года. Гэта таксама — у актыў. Праўда, плаціць працэнты па крэдыце неабходна будзе ўжо з наступнага месяца пасля яго атрымання.

Максімальная сума крэдыту падлічваецца спецыялістамі банка ў межах крэдытаздольнасці заяўніка, але не можа перавышаць 500 млн рублёў, а таксама быць большай за 90% ад арыенціровачнага кошту жылога памяшкання. Пры разліку максімальнай сумы крэдыту магчымы ўлік даходу мужа (жонкі), а таксама фізічных асоб, якія знаходзяцца ў блізкай роднасці, сваяцтве з заяўнікам, згодна з артыкуламі 60 і 61 Кодэкса Беларусі аб шлюбе і сям'і. А вось мінімальная сума такога крэдыту складае 10 млн рублёў.

#### І АФАРМЛЕННЕ МАЕ КОШТ

Адразу трэба заўважыць, што звычайна падобныя жыллёвыя пазыкі выдаюцца банкамі на даволі жорсткіх умовах забеспячэння.

СТАР. 3

**«Прамая лінія»**

## СЯМ'Я МАЕ ПРАВА НА ПАДТРЫМКУ

**Якія новыя віды сямейных дапамог з'явіліся сёлета? На якую падтрымку ад дзяржавы ўвогуле могуць разлічваць сем'і? Хто можа атрымаць мацярынскі капітал? Як можна будзе ім распарадзіцца?**

Гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце задаць **намесніку міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандру Аляксеевічу РУМАКУ** падчас «прамой лініі» «Сацыяльная падтрымка сям'і», якая пройдзе ў рэдакцыі «Звязды» **16 чэрвеня з 11 да 12 гадзін**.

Задаць пытанні падчас «прамой лініі» можна будзе па тэлефонах **8 (017) 287 18 66** і **8 (017) 287 18 71**.

Папярэдне пытанні можна задаць па тэл. **8 (017) 287 18 29** у працоўны час.

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА
5 разоў на тыдзень!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2015 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

# ЗАСТАВАЦЦА І ПРАЦАВАЦЬ НА СВАЁЙ ЗЯМЛІ —

## такую магчымасць жыхарам паўднёвага ўсходу Магілёўшчыны дасць падпісаны Прэзідэнтам указ

**Указ №235 «Аб сацыяльна-эканамічным развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці», які падпісаў Прэзідэнт, адкрывае для сямі раёнаў рэгіёна новыя магчымасці для развіцця. Гэтыя раёны найбольш пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС і ў апошні час заўважна адсталі ў развіцці. «Падцягнуць» іх да лідараў і мае на мэце падпісаны кіраўніком дзяржавы дакумент.**

У Клімавіцкім, Касцюковіцкім, Краснапольскім, Крычаўскім, Слаўгарадскім, Хоцімскім і Чэрыкаўскім раёнах указ прадугледжвае стварэнне неабходных умоў і некаторых прэферэнцый. Так, для фізічных асоб прадастаўляецца льгота па выплаце падаходнага падатку. Устанаўліваецца стаўка ў памеры 10 працэнтаў з даходаў у выглядзе аплаты працы, атрыманых па працоўных дагаворах (кантрактах) ад арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія зарэгістраваны на тэрыторыі паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці з 1 ліпеня 2015 года па 31 снежня 2020 года і займаюцца тут вытворчасцю тавараў (выкананнем работ, аказаннем паслуг) на працягу 7 гадоў з пачатку такой дзейнасці.

Для наймальнікаў і камерцыйных арганізацый, якія зарэгістраваны на тэрыторыі паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці з 1 ліпеня 2015 года па 31 снежня 2020 года і на працягу 7 гадоў займаюцца тут вытворчасцю тавараў (выкананнем работ, аказаннем паслуг), указам прадугледжаны льготы па абавязковых страхавых узносах па страхаванні выпадкаў дасягнення пенсійнага ўзросту, інваліднасці і страты карміцеля (пенсійнае страхаванне) у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Такія страхавыя ўзносы ўказам вызначаюцца ў памеры 24 працэнты.

Грамадзяне Беларусі, якія будуць будаваць (рэканструяваць) або набываць жылыя памяшканні ў населеных пунктах паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці, змогуць атрымліваць на гэта льготныя крэдыты тэрмінам да 20 гадоў пад 1 працэнт гадавых. Пры гэтым неабходна ажыццяўляць працоўную дзейнасць на тэрыторыі рэгіёна не менш як 10 гадоў з моманту атрымання такіх крэдытаў.

Указам таксама прадугледжана, што Магілёўскі абласны Савет дэпутатаў да 1 жніўня 2015 года зацвярдзіць праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці на перыяд да 2020 года, распрацаваную Магілёўскім аблвыканкамам у мэтах выканання даручэння кіраўніка дзяржавы.

Указ уступае ў сілу з 1 ліпеня 2015 года.

* * *

Як адзначае **старшыня Чэрыкаўскага райвыканкама Аляксандр МУРАЎЁЎ**, гэтага дакумента чакалі:

— Ва ўказе вельмі шмат прэферэнцый для людзей: па падаходным падатку, па фондзе сацыяльнай абароны насельніцтва, страхавых узносах... Мы спадзяёмся, што ўказ прыцягне ў наш рэгіён новых інвестараў, тым больш што незадзейнічаная працоўная сіла тут ёсць. Шчыра скажу, што раней нам не хапала як бюджэтнага фінансавання, так і прыватнага. Інвестары, па вялікім рахунку, не хацелі сюды ісці па розных прычынах, у тым ліку і з-за наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Асабліва хацелася б адзначыць магчымасць будаваць жыллё па льготных крэдытах пад 1 працэнт гадавых. Гэтая мера павінна затрымаць у раёне як сталае насельніцтва, так і нашу моладзь. Акрамя таго, мы спадзяёмся на хуткае прыняцце Магілёўскім абласным Саветам дэпутатаў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця нашага рэгіёна да 2020 года, у якой ужо будуць прапісаны канкрэтныя мерапрыемствы па будаўніцтве, развіцці гаспадаркі і іншых сферах.

■ Тры пытанні да ўлады

# НАЙПЕРШ — КАМФОРТНЫЯ ЎМОВЫ



**Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ ўпэўнены, што падпісаны Прэзідэнтам указ дазволіць па максімуме раскрыць вытворчы і чалавечы патэнцыял паўднёва-ўсходняга рэгіёна вобласці.**

***— Уладзімір Віктаравіч, што перш за ўсё ўлічвалася пры стварэнні праграмы развіцця паўднёва-ўсходніх раёнаў?***

— Праграма была распрацавана па даручэнні кіраўніка дзяржавы, якое ён даў летась пры наведванні Магілёўшчыны. Практычна кожны з сямі ўзгаданых у ёй раёнаў у большай ці меншай ступені акázаўся забруджаным у выніку аварыі на ЧАЭС.

У Чавускім раёне, напрыклад, дзе сёння жыве каля 19 тысяч чалавек, колькасць жыхароў калісьці даходзіла да 60 тысяч. Чарнобыльская трагедыя вельмі пагоршыла становішча ў гэтым і іншых раёнах, што трапілі пад яе ўздзеянне. Пры падрыхтоўцы праграмы мы ўлічвалі некалькі асноўных момантаў.

Трэба перш за ўсё стварыць камфортныя ўмовы для пражывання людзей. Гэта датычыцца сацыяльных аб'ектаў, экалогіі. І неабходна зрабіць усё для таго, каб насельніцтва магло прыбыткова займацца вытворчасцю, іншымі відамі дзейнасці. У студзені гэтага года праграма была абмеркавана і ўхвалена аблвыканкамам. Пэўны час спатрэбіўся, каб узгадніць яе з міністэрствамі і рэспубліканскімі ведамствамі. Рэалізаваць без падтрымкі дзяржавы ўсе пазіцыі, прадугледжаныя праграмай, было б немагчыма.

***— Наколькі прывабнымі для людзей і бізнесу будуць тыя ўмовы, якія гарантуе гэтая праграма?***

— Па-першае, насельніцтву даецца магчымасць менш плаціць у фонд сацыяльнай абароны. Па-другое, ахвотныя палепшыць жыллёвыя ўмовы змогуць атрымаць ільготны крэдыт на будаўніцтва жылля. Будзем прадугледжваць у бюджэце сродкі для таго, каб людзі, якія згодны тут жыць і працаваць, атрымлівалі больш таннае жыллё. Па-трэцяе, па падаходным падатку таксама будуць прадастаўляцца льготы на перыяд дзеяння гэтай праграмы. Усё робіцца дзеля таго, каб людзі маглі развіваць свой бізнес. У далейшым яны будуць працаваць, як і ўсе астатнія суб'екты гаспадарання на тэрыторыі Магілёўскай вобласці. Для таго, каб у гэтых раёнах замацоўваўся і развіваўся бізнес, мы павінны стварыць пэўную інфраструктуру. Нешта накшталт таго, што ўяўляе сабой СЭЗ «Магілёў». Гэта можа прыцягнуць інвестараў, у тым ліку і з-за мяжы.

***— Падчас апошняга наведвання Прэзідэнтам Слаўгарадскага раёна ўздымалася пытанне самазанятасці насельніцтва. Як гэта падтрымліваецца дзяржавай?***

— Самазанятасць — гэта тое ж самае прадпрымальніцтва. Чалавек паглядзеў, што нейкая справа ў яго атрымліваецца лепш, чым у іншых людзей. Ён спадзяецца, што гэта будзе прыносіць яму прыбытак. Хтосьці, напрыклад, вырашыў, што яму выгадна займацца жывёлагадоўляй ці перапрацоўкай малака. Сапраўды, у Слаўгарадзе шырока прадстаўлена сельскагаспадарчая вытворчасць, сыраробства, і гэта вельмі добра. Мы стварaем умовы для таго, каб людзі мелі магчымасць замацавацца ў малым і сярэднім бізнесе. Для падтрымкі і развіцця падсобных гаспадарак і промыслаў у краіне існуе шэраг законаў. Гэта выдзяленне сельскагаспадарчай тэхнікі, зямлі і гэтак далей. Пытанні па забеспячэнні пашай, кармамі знаходзяцца на кантролі мясцовых выканаўчых і прадстаўнічых улад. За той час, што я знаходжуся на пасадзе старшыні аблвыканкама, ніводнай скаргі ад насельніцтва на недахоп кармоў ці пашы не паступала. Гэта сведчыць аб тым, што пазіцыя мясцовай улады толькі садзейнічае таму, каб самазанятасць развівалася.

Людзі ў Магілёўскай вобласці наогул вельмі працавітыя. І ў паўднёва-ўсходніх раёнах дастаткова працоўных рэсурсаў. Ёсць пэўныя цяжкасці з кадрамі сярэдняга звяна ў асобных галінах эканомікі. Але ў цэлым усё гэта можна паправіць.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■ Зялёнае жніво: на кантролі

# СЯНАЖ — У СІЛАС

## Безгаспадарчасць на сельгаспрадпрыемствах можа каштаваць дзяржаве занадта дорага

**Учора на калегіі Камітэта дзяржаўнага кантролю разглядалі вынікі маніторынгу падрыхтоўкі і правядзення вясенніх палявых работ у сельскагаспадарчых арганізацыях, а таксама навядзення парадку на зямлі і сельскааб'ектах. «Несвоечасовы рамонт сельскагаспадарчай тэхнікі, незабяспечанасць мінеральнымі ўгнаеннямі, нястача паліўна-змазачных матэрыялаў, невыкананне тэхналагічных рэгламентаў — гэта далёка не поўны пералік упушчэнняў і недахопаў, якія адмоўна паўплывалі на ход і якасць пасяўной, — заявіў старшыня Камітэта дзяржкантролю Леанід АНФІМАЎ.**

«Яшчэ рана казаць пра вынікі, але з такім пачаткам пастаўлення дзяржавай перад аграпрамысловым комплексам задачы ў поўным аб'ёме выканаць будзе вельмі складана. На наш погляд, прычына не толькі ў нездавальняючым фінансавым стане сельгасарганізацый, але і элементарнай безгаспадарчасці і нежаданні працаваць якасна», — дадаў кіраўнік КДК.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення кантролю за работай аграпрамысловага і прыродаахоўнага комплексаў Камітэта дзяржаўнага кантролю Сяргей ФЕДЧАНКА** больш падрабязна расказаў аб парушэннях: «Сёлета горш падрыхтавана матэрыяльна-тэхнічная база для правядзення пасяўной. Былі зацягнуты тэрміны. Не ўнесілі дастатковую колькасць угнаенняў. Некаторыя сеялі наогул без угнаенняў. Выкарыстоўвалася насенне нізкай якасці, а ў краіне хапае элітнага насення айчынных гатункаў. Чамусьці часта завозіліся за мільёны долараў імпартныя пасяўныя матэрыялы. Для чаго мы тады выдаткоўваем грошы на селекцыю? Значыць, і недахоп фінансавання не мог быць прычынай», — канстатуе Сяргей Федчанка. Пакуль што ёсць яшчэ час на тое, каб сельская гаспадарка калі не выправіла усе недахопы, то мінімізавала страты ад нядбайнай працы. Пры гэтым тых, хто вінаваты ў такой нядбайнасці, будуць прыцягваць да адказнасці. У адной гаспадарцы сеялі ячмень з грубымі парушэннямі: выкарыстоўваўся пасяўны агрэгат з парванымі насеннепроводамі. Аналагічныя факты парушэння тэхналогіі пасеву былі выяўлены ў многіх гаспадарках. Для ўтойвання гэтых фактаў кіраўнікі займаліся прыпіскамі.

«Складваецца ўражанне, што сітуацыя на сяле набывае некіраваны характар», — заявіў начальнік галоўнага ўпраўлення. Праблемы не толькі з пасяўной. Горшай была і корманарыхтоўка. «Аб'ектыўнай прычыны, каб не весці корманарыхтоўкі так, як гэтага патрабуе тэхналогія, няма. Дажджы невялікія. Надвор'е самае спрыяльнае. Акрамя арганізацыйных прычын, ніякіх іншых я не бачу». Сёлета мы можам недабраць 15% ад леташняга паказчыка нарыхтоўкі кармоў. Ёсць і зусім жахлівыя выпадкі. У адной гаспадарцы сянаж закладваецца ў сілас. Але ўсе спецыялісты ведаюць, што шматгадовыя травы не выкарыстоўваюцца для сіласу!

Аднак маюць рацыю тыя кіраўнікі, што скардзяцца на дрэнную айчынную тэхніку, з-за якой немагчыма нармальна працаваць. «Праведзены маніторынг сельгастэхнікі гаворыць аб тым, што часта скаргі на нізкую якасць айчыннай тэхнікі справядлівыя. Шматлікія выхады са строю як гарантыйнай, так і постгарантыйнай тэхнікі наўпрост уплываюць на тэрміны сельскагаспадарчых работ», — сказаў Сяргей Федчанка.

Складаная сітуацыя і з добраўпарадкаваннем тэрыторый: «Трупы жывёл, гнаявая жыжка на палях, звалкі смецця... І гэта не адзінкавыя факты ў шэрагу сельгасарганізацый».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

# НЕ ПАЎТАРЫЦЬ ПАМЫЛАК

**У камунальным унітарным сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Племянны завод «Чырвоная зорка» Клецкага раёна плануюць да 15 чэрвеня закончыць нарыхтоўку кармоў з траў першага ўкосу. Зрэшты, як і ва ўсіх гаспадарках Міншчыны.**

Нарыхтоўка кармоў для грамадскага статку — адна з найважнейшых кампаній для сельгасвытворцаў. І кожны разумее, што трэба правесці яе не толькі своечасова, але і якасна. Менавіта ад гэтага залежыць вытворчасць малака і мяса на працягу практычна 7-месячнага стойлавага ўтрымання жывёлы.

— У «Чырвонай зорцы» налічваецца больш за 7 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы. Каб пракарміць статак, нам неабходна нарыхтаваць за ўвесь сезон больш як 30 тысяч тон сенажу і столькі ж сіласу. Сёлетнія кліматычныя ўмовы дазваляюць у дастатковай колькасці назапасіць фактычна ўсе віды кармоў, — лічыць дырэктар прадпрыемства Анатоль Коршун. — Частка пасеваў ужо скошана. Але, на жаль, павялічваецца разрыў паміж скошаным і прыбраным.

А гэта вядзе да падсыхання травы, і штодзень даводзіцца думаць, на які від кармоў яе выкарыстаць у залежнасці ад вільготнасці.

Штодня на поле выходзіць 36 адзінак тэхнікі, якая працуе з 8 раніцы да 8 вечара.

— З наступленнем цёплых начэй травы растуць літаральна на вачах. Таму не спыняем уборку і ў цёмны час сутак, — распавёў адзін з механізатараў. — Кіраўніцтва папрасіла нас мабілізавацца па максімуме. Ды мы і самі ўсё разумеем, не першы год на нарыхтоўцы кармоў: нельга ўпускаць спрыяльныя ўмовы.

У гаспадарцы зрабілі стаўку на павелічэнне бабовых культур, будуць перазалужаць 772 гектары пад люцэрну. Бясспрэчна, патрэбны немалыя высілкі і затраты.

**Генадзь САЛАВЕЙ, старшыня Клецкага райвыканкама:**

*— Клецкі раён — сельскагаспадарчы. Сёння адказны этап для нас — нарыхтоўка кармоў. У залежнасці ад іх колькасці і якасці на працягу года можам разлічваць на вытворчасць мяса і малака. Наш малочны завод арыентаваны на экспарт (60% у структуры таварнай прадукцыі), і мы павінны цалкам забяспечыць сваё прадпрыемства малаком. Завод перапрацоўвае больш як 310 тон штодзённа, самі мы пастаўляем 208 тон, астатняе пакуль закупляем за межамі раёна.*



Але гэта дасць магчымасць забяспечыць племянную жывёлу паўнавартасным бялком, а значыць, захаваць яе здароўе і прадукцыйнасць.

У «Чырвонай зорцы» сёння надойваюць па 17,3 кілаграма на карову. Не шмат. Але з кожным днём назіраецца тэндэнцыя да павелічэння. «Галоўнае, што жывёла выйшла з зімовага стойлавага ўтрымання ў добрым стане, здаровая, — канстатуе дырэктар. — Мы прааналізавалі ранейшыя памылкі, зробленыя падчас мінулай нарыхтоўкі кармоў, зімоўкі статку, каб не паўтарыць іх у гэтым сезоне».

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■

# З новай поштай!

## Чарговае аддзяленне паштовай сувязі адкрылася ў Мінску

**Гэтым разам пашчасціла жыхарам мікрараёна Сухарава-5: цяпер атрымліваць паслугі пошты яны змогуць па адрасе Панчанкі, 60. Тут запрацавала аддзяленне № 59. Яно ўжо 21-е па ліку ў раёне і 117-е ў Мінску.**

Аддзяленне паштовай сувязі аснашчана сучаснай тэхнікай і мэбляй, для зручнасці кліентаў тут працуе электронная чарга, усталяваны плацежна-даведачны тэрмінал для аплаты паслуг без камісіі. Ва ўтульнай кліенцкай зале наведвальнікам прапануюць паштовыя і няпрофільныя паслугі: выплату пенсій і дапамог, прыём і выдачу пісьмовай карэспандэнцыі, пасылак, адпраўленняў паскоранай пошты EMS, грашовых пераводаў, падпіску на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі, аплату камунальных паслуг і інш. Прадстаўлены шырокі асартымент марак, паштовак, канвертаў, картак для посткросінгу і іншай прадукцыі.







Для павышэння якасці і даступнасці паштовых паслуг, больш аператыўнага абслугоўвання кліентаў у аддзяленні паштовай сувязі арганізавана асобнае працоўнае месца па прыёме і выдачы паштовых адпраўленняў.

Ва ўрачыстым адкрыцці аддзялення бралі ўдзел намеснік генеральнага дырэктара па камерцыйных пытаннях РУП «Белпошта» Таццяна Гвоздзева, першы намеснік кіраўніка адміністрацыі Фрунзенскага раёна Сяргей Жалязняк, начальнік аддзела паштовай сувязі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Таццяна Таболіч.

Улічваючы імклівую забудову мікрараёна, адкрыццё новага паштовага аб'екта дасць магчымасць зняць нагрузку з бліжэйшых аддзяленняў і палепшыць якасць абслугоўвання кліентаў. Працаваць АПС № 59 будзе з панядзелка па пятніцу з 9.00 да 20.00, у суботу з 9.00 да 18.00, нядзеля — выхадны.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**




Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

# ЖЫЛЛЁ Ў КРЭДЫТ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У нашым выпадку гэта паручыцельства не меней за дзвюх фізічных асоб і (або) заклад набытага па крэдыце жылога памяшкання. Менавіта ў гэтым выпадку за афармленне неабходна будзе заплаціць. Складанне дагавора паручыцельства пад забеспячэнне вяртання крэдыту каштуе тут 150 тысяч, а афармленне дагавора аб закладзе нерухомасці — 250 тысяч рублёў.



## КРЭДЫТ ДАЮЦЬ НЕ ЎСІМ

Заяву на атрыманне жыллёвага крэдыту ў банку прымуць толькі ад грамадзяніна Беларусі, які зарэгістраваны тут і мае пастаянны, афіцыйна пацверджаны даход на тэрыторыі нашай краіны. Акрамя таго, крэдыт дадуць толькі тым, у каго агульная сума выплат (утрымання) па выканаўчых дакументах у суме не перавысіце 50% ад даходу, які застаецца пасля выплаты падаткаў. Дакладна не дадуць крэдыт тым кліентам, якія маюць праблемную запазычанасць і (або) адмоўную крэдытную гісторыю (для індывідуальных прадпрымальнікаў — запазычанасць па падатках, зборах і іншых плацяжах у бюджэт). Тэрмін разгляду пакета дакументаў складае 7 працоўных дзён.

## СТАЎКА ПЛАВАЕ

Бадай, самым галоўным крытэрыем любых крэдытаў з'яўляецца працэнтная стаўка. У нашым выпадку адразу гаворыцца пра 39% гадавых. Праўда, потым удакладняецца, што працэнтная стаўка за карыстанне крэдытам з'яўляецца пераменнай і змяняецца ў дзень змены стаўкі рэфінансавання (СР) Нацыянальнага банка. Увогуле, канкрэтная працэнтная стаўка для кліента падлічваецца па простай формуле (СР + 14%). Тады і атрымліваецца, што пры зніжэнні стаўкі рэфінансавання на 15%, стаўка па крэдыце стане ўжо 24%. А пры павялічэнні СР на 10 пунктаў за карыстанне крэдытам неабходна будзе плаціць ужо 49% гадавых.

***

**Чакаем вашых пытанняў пра карыстанне грашыма і ўсё, што з гэтым звязана. Вы можаце звяртацца на электронны адрас газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці па тэлефонах 8 (017) 292 38 02 і 8 (017) 287 17 51.**

**Сяргей КУРКАЧ.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ЖЫЦЦЁ Ў ФАРБАХ

**На тэрыторыі свабоднай эканамічнай зоны «Брэст» адкрылася новае прадпрыемства. Завод па вытворчасці фарбы, тынкоўкі, іншых будаўнічых матэрыялаў уяўляе з сябе яшчэ адну вытворчасць буйнога прадпрыемства СЭЗ «Дыском», якое працуе з 2000 года.**

Магутнасці завода на першым этапе дазволяць выпускаць больш за 16,5 тысячы тон фарбы ў год. Пазней плануецца нарасціць вытворчасць да 25 тысяч тон. Каля 70 працэнтаў прадукцыі мяркуецца прадаваць на ўнутраным рынку, астатняе пастаўляць у Польшчу, Літву, Латвію, Эстонію, Казахстан.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## «ЗЕБРА» Ў ФАРМАЦЕ 3D

**У Мінску на вуліцы Ульянаўскай з'явіўся пешаходны пераход, выкананы ў выглядзе 3D-малюнка.**

Па ўзгадненні з аддзелам ДАІ Партызанскага РУУС сталіцы яго нанеслі выкладчыкі і навучэнцы цэнтра дадатковага навучання дзяцей і моладзі «Вікторыя», каля якога і прапісалася аб'ёмная «зебра».

— Пад'язджаючы да такога перахода, кіроўцы міжволі будуць зніжаць хуткасць, а пешаходы змогуць больш бяспечна перасякаць праезную частку, — распавяла **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Партызанскага РУУС г. Мінска Таццяна СПАДАБАЕВА.**

Калі навоўвядзенне пакажа сваю эфектыўнасць, дык падобныя малюнкі з'явяцца і на іншых вуліцах раёна, у першую чаргу каля вучэбных устаноў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## НІ АБУТКУ, НІ ГРОШАЙ

**Жыхарка Гродна перавяла грошы на электронны кашалёк «WebMoney», але пакупкі не дачакалася, пра што паведамляе прэс-служба УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

На Гродзеншчыне гэта ўжо не першы выпадак махлярства ў інтэрнэт-прасторы. На вуду ашуканцаў траплялі, у прыватнасці, аматары пародзістых сабак, экзатычных птушак і вось цяпер падманулі на... абутку. Дзяўчыну зацікавіла аб'ява ў адной з сацыяльных сетак, і яна спісалася з «прадаўцом басаножак». Той папрасіў папярэднюю аплату і атрымаў на свой электронны кашалёк «WebMoney» 400 тысяч беларускіх рублёў. Дзяўчына не дачакалася ні абутку, ні вяртання грошай.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ЗНАКІ ПАМЯЦІ

**Навучэнцы каледжа сферы абслугоўвання з Баранавіч вырашылі аказваць дапамогу людзям старэйшага пакалення... у падтрыманні знешняй прывабнасці.**

Аўтар маладзёжнага сацыяльнага праекта Святлана Бабій расказала, што напярэдадні яны правялі анкетаванне і абвергі міф, што людзям пасля 70 гадоў, акрамя харчавання, адзення і лекаў, нічога не патрэбна. «Бабулям і дзядулям важна выглядаць дагледжанымі», — заявіла дзяўчына. Таму студэнты-цырульнікі выказалі намер наведваць пажылых людзей, асабліва тых, хто не выходзіць з дому самастойна, і аказваць ім паслугі цырульні. Абслугоўванне кліентаў у рамках праекта «Знакі нашай памяці» будзе праводзіцца бясплатна.

**Яна СВЕТАВА.**

■ На слыху

# ІЗНОЎ ВІРУС?

**Урад Рэспублікі Карэя выдаткаваў звыш 300 млн долараў на падтрымку прадпрыемстваў, якія церпяць страты ад успышкі каранавіруса блізкаўсходняга рэспіраторнага сіндрому, паведамляюць замежныя СМІ. Пасля ацэнкі маштабаў страт малога бізнесу ўлады выдзяляць сродкі кампаніям, якія засталіся без кліентаў па прычыне распаўсюджвання інфекцыі. Сродкі будуць выдаткоўвацца і тым людзям, якія знаходзяцца пад хатнім каранцінам.**

Людзі баяцца наведваць грамадскія месцы, таму аб'ёмы продажу ў буйных супермаркетах упалі цягам аднаго тыдня на 16 працэнтаў, у невялікіх крамах — на 25. На сёння ў краіне ад віруса загінулі 9 чалавек, 108 — інфіцыраваныя; на хатнім каранціне — 2,9 тысячы чалавек, якія мелі кантакт з хворымі. Звыш 700 вучэбных устаноў зачынены на каранцін, тысячы замежных турыстаў адмяняюць паездкі ў гэту краіну. Пацверджаны і першы выпадак захворвання школьніка. Раней усім хворым было да 20 гадоў; лічылася, што дзеці і падлеткі неўспрымальныя да вірусу.

У Паўднёвай Карэі першым пацярпеў мужчына, які заразіўся падчас камандзіроўкі ў Саўдаўскую Аравію. Каранавірусы — гэта група вірусаў, якія выклікаюць вострыя рэспіраторныя і кішэчныя захворванні. MERS з'явіўся ў 2012 годзе, і яго асаблівасцю стала падабенства да SARS — атыповай пнеўманіі, ад якой у 2002—2003 гадах загінулі каля тысячы чалавек. Адкуль узялася «новая атыповая пнеўманія» — дакладна не вядома. Першы выпадак зафіксаваны ў Саўдаўскай Аравіі — тады загінуў 60-гадовы мужчына. У наступныя два гады заразіліся яшчэ 44 чалавекі, у асноўным у Саўдаўскай Аравіі і Аб'яднаных Арабскіх Эміратах. На 1 чэрвеня гэтага года СААЗ зафіксавала 1154 выпадкі заражэння каранавірусам блізкаўсходняга рэспіраторнага сіндрому, пры гэтым амаль палова выпадкаў мела лятальны зыход.

## ЯК ПРАЯЎЛЯЕЦЦА?

Першыя некалькі дзён каранавірус падобны да прастуды, аднак дзесьці праз тыдзень з'яўляецца вострая ныркавая недастатковасць і вострая пнеўманія. Усё гэта суправаджаецца гарачкай, кашлем, задышкай, цяжкім дыханнем.

## ЯК ПЕРАДАЕЦЦА?

Урачы мяркуюць, што MERS перадаецца паветрана-кропельным шляхам. Спецыяльнай вакцыны ад гэтага каранавіруса няма, але ён можа быць адчувальны да прэпаратаў, якімі лечаць некаторыя іншыя інфекцыі.

## ЯК ЗАСЦЕРАГАЦЦА?

Урачы не забараняюць цалкам выезд у пералічаныя краіны, а толькі рэкамендуюць усім, хто накіроўваецца ў Карэю і на Блізкі Усход, трымацца той жа засцярогі, што і падчас успышак грыпу — часта мыць, дэзінфіцыраваць рукі, не дакранацца імі да вачэй, носа і рота, пазбягаць месцаў з вялікай колькасцю людзей.

Ніякіх прадказанняў адносна тэмпаў распаўсюджвання віруса спецыялісты не даюць. Аднак можна спадзявацца на досыць магутную сістэму аховы здароўя на Усходзе, а таму ёсць вялікія шанцы, што эпідэмію ўдасца купіраваць.

**Святлана БАРЫСЕНКА** ■

■ Медыяпрастора

**На X Беларускі міжнародны медыяфорум, які праходзіў у Мінску з 7 па 10 чэрвеня, з'ехаліся вядучыя медыяперсоны блізкага і далёкага замежжа. Меркаванні некаторых з іх наконт развіцця сучасных сродкаў масавай інфармацыі давялося пачуць, як кажуць, з першых вуснаў.**

# РАЗАБРАЦЦА Ў ТЫМ, ШТО АДБЫВАЕЦЦА


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

На небяспечнае становішча ў свеце звярнуў увагу **вядучы праграмы «Кропка адліку» тэлеканала Russia Today Аляксандр ГУРНОЎ**, які паразважаў на тэму таго, наколькі сучасная журналістыка аб'ектыўная:

— Сёння свет як ніколі blізка знаходзіцца да магчымага ўзнікнення вайны. І гэта вельмі небяспечная сітуацыя. Небяспечная тым, што ёсць некалькі людзей, якія ведаюць, што вайна дабром не скончыцца. Але ёсць вялікая колькасць такіх, хто зарабляе свой хлеб тым, што імкнецца пераканаць першых: можна крыху і паваяваць.

**— А як нам, журналістам, у гэтай сітуацыі інтэрпрэтаваць падзеі, каб, самае галоўнае, не нашкодзіць?**

— Неабходна паспрабаваць разабрацца ў тым, што адбываецца. Мы ўсе сыходзім з таго, што новая вайна немагчымая. А яна рэальна можа быць. Ёсць пэўныя механізмы, якія аўтаматычна вядуць да вайны. Мы ўсе мяркуем, што Другую сусветную вайну распачаў Гітлер. Збольшага гэта праўда. Але калі мы ўзгадаем Першую сусветную вайну, яна пачалася аўтаматычна. І гэта нягледзячы на тое, што амаль усе кіраўнікі краін былі паміж сабой сваякамі. Настолькі яны загуляліся ў палітыку (мы вельмі блізкія да гэтага зараз), што варта было забіць аднаго Фердынанда, як аўтаматычна пачалася Першая сусветная вайна. Такое можа адбыцца і сёння. І гэта вельмі небяспечная тэндэнцыя, з якой неабходна змагацца.

**— А ці могуць прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі супрацьстаяць ваенным канфліктам? Ці мы бяссільныя?**

— Мы можам канфлікт распальваць, а можам не распальваць. Калі казаць шчыра, зараз мы яго распальваем. І аб'ектыўныя журналісты павінны, як мінімум, гэтаму супрацьстаяць. Фактычна даваць бой той прапагандзе, якая прыходзіць з розных бакоў, процістаяць шматлікім нападкам. Аднак нават аб'ектыўная журналістыка аказваецца ў стане вайны. Мы павінны разам працаваць над тым, каб палепшыць паразуменне паміж нашымі краінамі.

# «ПУБЛІЦЫСТЫКА СЫХОДЗІЦЬ У ЦЕНЬ»

Лічбавыя і сеткавыя тэхналогіі, якія ахапілі ўвесь свет, стварылі ў дадатак да традыцыйных СМІ — газет, радыё, тэлебачання — магчымасць вельмі аператыўнай падачы інфармацыі відавочцамі падзей. Але як гэта адаб'ецца на стане прафесіянальнай журналістыкі? І як новыя медыя дапаўняюць звыклыя? Гэтыя пытанні абмяркоўваліся на X Беларускім міжнародным медыяфоруме вядучымі журналістамі краін СНД.

— Мы прывыклі думаць катэгорыямі, калі прафесіянальныя журналісты прадстаўляюць сродкі масавай інфармацыі. Але мушу канстатаваць, што за апошняе дзесяцігоддзе значная частка насельніцтва стала чэрпаць інфармацыю з сацыяльных сетак, — гаворыць **дырэктар Кыргызскага нацыянальнага інфармацыйнага агенцтва «Кабар» Кубанычбек ТААБАЛДЫЕЎ**. — Яны, у сваю чаргу, прызначаны для масавай камунікацыі паміж людзьмі. Разам з тым, у іх змяншаецца роля прафесійных журналістаў, бо расказаць аб якой-небудзь падзеі можа кожны ў рэжыме рэальнага часу. Вядома, па сацыяльных сетках вандруе шмат і ілжывай інфармацыі — так званых фэйкаў. Але новыя медыя прыносяць і вялікую карысць.

На ўсходнім беразе знакамітага кыргызскага возера Ісык-Куль месціцца сяло Карумду. Ваяваць з захопнікамі на фронт падчас Вялікай Айчыннай з Карумду адправіліся 119 чалавек. Дадому з іх вярнуліся толькі 40. Але чамусьці ў сяле дагэтуль не было ніводнага помніка загінулым байцам Чырвонай Арміі. Мясцовы жыхар, у якога бацька ваяваў у складзе Панфілаўскай дывізіі, выправіў гэтую хібу за ўласныя сродкі. І ўпершыню інфармацыя пра гэта з'явілася менавіта ў адной з сацыяльных сетак.

За апошняе дзесяцігоддзе сродкі масавай інфармацыі змяніліся непазнавальна. Усё часцей назіраецца перапляценне іх відаў, калі, напрыклад, на сайце друкаванага выдання з'яўляюцца відэасюжэты або запісы гуку, як на радыё. Якімі ж яны стануць праз некалькі гадоў?

— Наўрад ці апраўдаецца думка, што інтэрнэт знішчыць дзеючыя СМІ, — лічыць **дырэктар Дырэкцыі гісторыка-публіцыстычных праграм Грамадскага тэлебачання Расіі Леанід МЛЕЧЫН**. — Калісьці ж нам расказвалі, што тэлебачанне знішчыць кіно і тэатр, а яны спакойна суіснуюць і дагэтуль. Інтэрнэт — гэта не сродак масавай інфармацыі, а толькі спосаб яе дастаўкі. Ён ліквідаваў праблему яе недахопу: усё, што адбываецца, можа быць перададзена імгненна — іншая справа, як з агульнай плыні чытачу выбраць патрэбнае. Дзякуючы яму вырашаецца і ідэя пра свабоду думак. Але два ключавыя складнікі журналістыкі ў сённяшніх умовах сыходзяць у цень. Гэта аналітычная і расследчая журналістыка. І тое, і другое патрабуе не толькі прафесіяналізму, але і шмат грошай. Мы ведаем, што некаторыя расследаванні нашых калег праводзіліся на працягу года. Але дзе сёння такое магчыма? А без аналітыкі для журналістыкі няма магчымасці рухацца наперад...

# ПРАЎДА ПАТРЭБНА ЎСІМ

Пра асаблівасці асвятлення падзей Другой сусветнай вайны ў Германіі і ўвогуле адносіны нашчадкаў пераможаных да трагедыі, якая адбылася на тэрыторыі Беларусі больш за 70 гадоў таму, расказаў **галоўны рэдактар нямецкага часопіса «Osten» («Восток») Петэр ФРАНКЭ**:

— Самае галоўнае — успаміны аб Вялікай Айчыннай вайне. І для нас вельмі важна перадаць гэтую інфармацыю падрастаючаму пакаленню. Для таго трэба выкарыстоўваць сродкі масавай інфармацыі. Людзі, якія былі сведкамі мінулых падзей, паступова паміраюць, і трэба знаходзіць іншыя формы перадачы дакументальных звестак.

***— Ваш часопіс арыентаваны на аўдыторыю постсавецкай прасторы. У апошні час назіраюцца тэндэнцыі, калі спрабуюць перапісаць гісторыю, навязаць яе новыя варыянты. Якая ваша пазіцыя? Дзе шукаць праўду?***

— Праўду заўсёды цяжка знайсці. У Карла Маркса ёсць такое выказванне: «Тыя, хто піша гісторыю, з'яўляюцца тымі, хто яе вызначае». І ў сённяшніх рэаліях гэта сапраўды вельмі часта адбываецца. Магу сказаць пра Германію, дзе я жыву, што ў нас прадстаўленне інфармацыі ў СМІ дастаткова аднабаковае. І там вельмі цяжка знайсці праўду.

***— Якім чынам нямецкія сродкі масавай інфармацыі асвятляюць падзеі Вялікай Айчыннай вайны?***

— Рыхард Вайцзекер, федэральны прэзідэнт Германіі ў 1984—1994 гадах, першым сказаў, што 8 мая — дзень вызвалення. Тады якраз і задумаліся, як абыходзіцца з гісторыяй Другой сусветнай вайны. І нашы людзі пачалі разумець, што гэта сапраўды было вызваленне ад фашызму, а не проста паражэнне, як гэта раней было прынята лічыць. Наша грамадства займаецца праблемамі Другой сусветнай вайны. Аднак у людзей ёсць розныя палітычныя падаплёкі: у кансерватараў — свой пункт гледжання, у левых ён іншы.

***— А ці ведае сучаснае пакаленне немцаў, якія жудасныя ўчынкі здзяйснялі іх продкі на тэрыторыі Беларусі?***

— Наўрад ці яны гэта ведаюць. Акрамя, напэўна, тых, хто працуе разам з беларусамі, як, напрыклад, чарнобыльская ініцыятыва. Яны бываюць тут, сустракаюцца з людзьмі і



ведаюць пра тое, што адбывалася ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Асабліва пачынаюць разумець, што нарабілі тут нямецкія войскі, падчас наведвання мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Аднак, я думаю, што большасць немцаў гэтага не ведае. Калі гавораць пра Другую сусветную вайну, то ўспрымаюць яе як вайну паміж рускімі і немцамі.

**Вераніка КАНЮТА, Валяр'ян ШКЛЕННІК** ■


Официальные правила Рекламной игры

«Отличная идея – выиграть 2!»

IdeaBank Отличная идея!

1. Настоящая рекламная игра называется «Отличная идея – выиграть 2!» (далее по тексту – «Игра»), проводится в соответствии с условиями настоящих правил (далее по тексту – «Правила») с соблюдением требований законодательства Республики Беларусь без взимания с участников Игры дополнительной платы.

Игра имеет целью стимулирование продаж в Республике Беларусь кредитных продуктов Закрытого акционерного общества «Идея Банк», за исключением кредита «Твои мечты».

2. Организатором Игры является Закрытое акционерное общество «Идея Банк», зарегистрированное Национальным банком Республики Беларусь решением от 24 апреля 2004 года №58 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 807000122. Юридический адрес: Республика Беларусь, 220034, г. Минск, ул. З. Бядули, д. 11, электронный адрес info@ideabank.by (далее – Организатор).

3. Для контроля за ходом Игры создается Комиссия по ее проведению. Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения Игры в следующем составе:

Председатель:

Хватик Николай Николаевич, начальник управления обслуживания частных клиентов ЗАО «Идея Банк»;

Члены Комиссии:

Дубовец Николай Николаевич, начальник управления партнерского сотрудничества ЗАО «Идея Банк»;

Суходольская Инна Викторовна, специалист сектора рекламы ЗАО «Идея Банк»;

Новиков Андрей Сергеевич, директор ООО «Техномода»;

Садовская Ксения Александровна, главный экономист управления партнерского сотрудничества ЗАО «Идея Банк».

4. Участником Игры может стать физическое лицо, являющееся гражданином Республики Беларусь либо имеющее вид на жительство в Республике Беларусь, выразившее желание принять участие в Игре путем заключения кредитного договора на условиях, установленных настоящими Правилами, и выполнившее условия участия в Игре.

Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

5. Игра проводится на территории Республики Беларусь.

Срок начала Игры – 14 июня 2015 года.

Срок окончания Игры, включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения Игры, – 31 июля 2015 года.

Розыгрыш призов проводится 20 июля 2015 года в соответствии с пунктом 9 настоящих правил Игры.

6. Для того чтобы принять участие в Игре, необходимо:

- в период с 14 июня 2015 года по 14 июля 2015 года заключить с Банком кредитный договор на условиях одного из кредитных продуктов, за исключением кредита «Твои мечты», и получить кредит согласно условиям заключенного договора.

- на 19.07.2015 заключенный кредитный договор должен быть действующим и не погашен досрочно;

- на 19.07.2015 должен отсутствовать факт просрочки исполнения кредитополучателем обязательств перед Банком по всем заключенным договорам.

7. Призовой фонд Игры.

В рамках Игры в качестве призов разыгрываются денежные средства, направляемые в счет погашения кредита, на сумму остатка основного долга, но не более размера задолженности на момент выдачи приза, за вычетом суммы денежных средств, перечисленных в счет гарантийного депозита.

Призовой фонд сформирован в следующем размере:

| № | Наименование | Единица измерения | Кол-во | Сумма на 1 ед. | Всего |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Денежные средства на сумму остатка основного долга, но не более размера задолженности на момент выдачи приза, направляемые в счет погашения кредита. | суммы | 5 | 70 000 000 | 350 000 000 |

Призовой фонд Игры в размере 350 000 000 (триста пятьдесят миллионов) белорусских рублей сформирован за счет денежных средств Организатора.

8. Права участников Игры.

Участник Игры имеет право: знакомиться с Правилами Игры, принимать участие в Игре на условиях, определенных Правилами.

9. Розыгрыш Призов, определение Победителей Игры.

Розыгрыш призов осуществляется по адресу: 220034, РБ, Минск, ул. З. Бядули, 11 20 июля 2015 года в 15.00.

В розыгрыше призов принимают участие все участники Игры, при этом участники Игры, выполнившие условия настоящих Правил более одного раза, принимают участие в розыгрыше один раз.

Определение победителей осуществляется с помощью лототрона. Для проведения каждого розыгрыша призов используется набор шаров в количестве 10-ти штук с номерами от 0 по 9.

За ходом каждого розыгрыша призов следит комиссия по проведению Игры. Итоги каждого розыгрыша призов Игры фиксируются в Протоколе Комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.

Определение выигрышных номеров получателей Призов происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из барабана.

Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера член комиссии помещает в барабан шары с номерами, соответствующими первым слева цифрам номера кредитного договора, участвующего в розыгрыше. Член комиссии извлекает из барабана один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера.

После этого в барабан загружаются все десять шаров, шары перемешиваются, и из барабана извлекается шар, номер которого определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Номер шара вносится в протокол, производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах порядковых номеров в базе номеров кредитных договоров и при наличии совпадения выпавший номер шара записывается в соответствующий разряд выигрышного номера. В противном случае извлеченный шар не возвращается в барабан, и член комиссии извлекает следующий шар. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон соответствующих разрядов порядковых номеров в базе номеров кредитных договоров.

Таким образом определяются пять победителей рекламной игры.

Организатор не позднее 22.07.2015 извещает Победителей о выигрыше заказными письмами с уведомлением по адресам, указанным в заключенных с Банком договорах.

10. Вручение Призов Победителям Игры.

Победитель может получить приз в офисе организатора по адресу: г. Минск, З. Бядули, 11 в период с 21.07.2015 по 31.07.2015 включительно.

При получении приза Победитель должен иметь при себе документ, удостоверяющий личность (действительный паспорт гражданина Республики Беларусь, вид на жительство).

Для зачисления выигранной суммы Победитель должен предъявить документ, удостоверяющий личность, и подписать заявление на перевод денежных средств на счет по учету кредитной задолженности.

Проценты, начисленные к моменту внесения суммы основного долга, Победитель должен внести за счет собственных средств.

11. Победитель несет ответственность за уплату подоходного налога в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Факт участия в Игре подразумевает, что ее Участники соглашаются с тем, что в рамках Игры их имена, отчества, фамилии, фотографии, интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в рекламных материалах. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Все права на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

Организатор не несет ответственности за работу почтовых служб, телефонной связи и Интернета.

Участники Игры, претендующие на получение Приза, обязуются заполнить и подписать все документы, предоставляемые Организатором Игры, необходимые для получения Призов.

Участие в Игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

В случае письменного отказа Победителя от получения Приза либо неполучения его в установленные Правилами сроки, либо нарушения Победителем настоящих Правил, приз остается у Организатора и используется по его усмотрению.

12. Информация об Игре, публикация Правил Игры.

Правила Игры будут опубликованы в газете «Звязда» до начала Рекламной Игры.

Результаты Рекламной Игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» не позднее 31 июля 2015 года.

Дополнительно информацию об Игре можно получить по телефону: + 375 (17) 306-33-14 либо короткому номеру 7555 с мобильных с 08.00 до 20.00 или на сайте www.ideabank.by.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры №2576 от 8 июня 2015 г. выдано Министерством торговли Республики Беларусь.



Фота Надзеі БУЖАН.

## БЕГ ЗА ШЧАСЦЕМ

Пра што вы думаеце, калі спускаецеся на эскалатары ў метро, вяртаецеся дадому па ажыўленай вуліцы, чакаеце ў краме сваёй чаргі? Я, як правіла,назіраю за людзьмі. І практычна штораз лаўлю сябе на думцы: як шмат у нас нешчаслівых жанчын. Не проста жанчын — а маці, жонак, нявестак, бабуль... На першы погляд — паспяховыя, на абцасіках, магчыма, нават з усмешкай на вуснах, але дастаткова зазірнуць у вочы — і патанаеш у суме, мітусні, хваляванні, незадаволенасці...

Ёсць такія і сярод маіх знаёмых. Большасць з іх вінавацяць у сваіх няшчасцях мужа-алкаголіка, сына-лайдака, суседанахабніка... Карацей кажучы, усіх, акрамя сябе. Гэтым ставячы СВАЁ шчасце ў залежнасць ад некага-нечага. Замест таго, каб набрацца смеласці і зазірнуць у сябе, паглыбіцца і зразумець, нарэшце, сапраўдную прычыну дысгармоніі. І памяняць нешта ў сабе. Бо, як казаў любімы многімі Юрый Нікулін, калі кожны з нас зробіць шчаслівым хоць аднаго чалавека, будзе шчаслівым увесь свет. І гэты чалавек — ты сам. А нешчаслівы чалавек наўрад ці здольны зрабіць шчаслівым некага іншага...

Са Светай я пазнаёмілася гадоў 10 таму. Ужо тады яна лічыла сябе самай няшчаснай на свеце. І мроіла замужжам. Думала (не, была перакаНана!), што з'яўіцца Ён і ў адно імгненне, як па ўзмаху чароўнай палачкі, зробіць яе шчаслівай. І што вы думаеце: замуж яна выйшла раней за нас усіх, але шчасця ў яе вачах не было, так няма і дагэтуль. «Як можна быць шчаслівай без дзяцей? — працягвала апраўдваць сваю незадаволенасць Света, зноў ставячы сваю ўнутраную гармонію ў залежнасць на гэты раз ужо не ад мужа, а ад дзяцей. — Вось нараджу — і ўсё зменіцца!..»

Калі кажаш ёй, што не ў замужжы хаваецца «тое, што яна шукае» і не ў пэўных рэчах або патрэбах, пагаджаецца. Але пры гэтым, дзіўная рэч, працягвае глядзець, як у іншых, зайздросціць чужому «шчасцю», губляючы пры гэтым самае каштоўнае — час для зносін з сабой. Замест таго, каб задаць сабе надзвычай важнае пытанне «а што асабіста для мяне шчасце?», зноў гоніцца за чарговым стэрэатыпным «прывідам» — машынай, кватэрай, новай сукенкай... А пры сустрэчы ў яе вачах «чытаюцца» такія звыклыя разгубленасць і незадаволенасць: маўляў, быццам бы ўсё ёсць для шчасця, але па-ранейшаму чагосьці не хапае... Чагосьці галоўнага!

Я сама, што хаваць, час ад часу лаўлю сябе на думцы, што захапілася самым папулярным і самым бессэнсоўным відам спорту — бегам за нейкім уяўным шчасцем. Замест таго, каб атрымліваць асалоду ад кожнага моманту, цаніць сапраўднае, забягаю наперад (у заўтрашні дзень, у наступны год) і псую жыццё непакоем пра будучыню. Заняўшыся толькі на першы погляд тэрміновымі і важнымі справамі, забылася патэлефанаваць бацькам, зноў адклала на неакрэсленае заўтра кнігу Івана Чыгрынава, а апошні запіс у асабістым дзённіку быў зроблены ажно два месяцы таму. У гэтым бессэнсоўным жыцці-гонцы пануюць хваляванне і страх нешта не паспець... Мімалётам у люстэрку бачу патухлыя вочы і толькі тады кажу сабе: «Стоп, спыніся — так быць не павінна!» Разумею, што, захапіўшыся пагоняй за «прывідам», можна не заўважыць, як страціш сябе... І хуценька апускаю «ногі ў ваду». Менавіта так называецца закон клоўна Вячаслава Палуніна. «Кожныя тры-пяць гадоў садзіцца на беразе ракі, апусціць ногі ў ваду і думаць. Што ты зрабіў за гэты час? Навошта? Ці трэба гэта было рабіць? Куды ты ідзеш? І ці туды ты рухаешся? Ладзіць сабе так званую рэвізію: шчаслівы ты ці не? І калі адчуваеш на целе карosту няшчасця — яе неабходна ліквідаваць. Гэта значыць, трэба зразумець, што менавіта і ў якім месцы няправільна. І знайсці ў сабе сілы з гэтага месца сысці. А гэта зусёды вельмі балюча. Вельмі няпроста. І абсалютна неабходна». Я згодна з кожным словам, акрамя аднаго. ПеракаНана, што лепей наогул ногі з вады не вымаць...

**Надзея ДРЫЛА.**


# Сямейная газета

Выпуск № 9 (32)


■ Быць разам

# ВЕРА, НАДЗЕЯ, ЛЮБОЎ, ІХ БРАТ І БАЦЬКІ

## Да выпускнога балю рыхтуюцца сёстры-трайняты з Кобрына

**Першы раз я трапіла ў гэтую сям'ю сямнаццаць гадоў таму, калі ў Селехаў нарадзіліся немаўляткі. Гэта цяпер некалькі разоў на год сродкі інфармацыі дружна паведамляюць пра нараджэнне ў розных рэгіёнах краіны трайні. Яшчэ нейкія два дзесяцігоддзі таму паяўленне на свет адразу траіх дзяцей было з'явай даволі рэдкай. Таму ў Кобрын мы накіраваліся, як толькі шматдзетная мама выпісалася з бальніцы і вярнулася дадому.**



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

### ПАДАРУНАК ЛЁСУ

Іван і Марыя Селехі яшчэ, падалося, не паспелі канчаткова ўсвядоміць сябе бацькамі чацвярых дзяцей. Тады Марыя прызналася, што нейкі час была разгубленая. У маладой сям'і рос сынок, яны не супраць былі займець і дачушку. А тут на УГД яе агаросшылі: «Віншуем, матулька, чакаюцца двайняты!» Пакуль ачомалася, звыклася з думкай аб двойні, стала прыглядацца да двухмесных калясак на рынку, падышла пара нараджаць. Накіравалі ў Брэст і ад абласных медыкаў пачула новае віншаванне: «Трымайцеся, матулька, у вас трайня на падыходзе!» Тут не кожная самая загартаваная нервовая сістэма вытрымае. Але як казала адна мудрая жанчына, «даў Бог дзяцей, дасць і сілы іх выгадаваць». Так і сталася. Дапамагалі патроху ўсе родныя. Вядома, найперш муж, тады ён служыў у райаддзеле МНС. Яго мама, Надзея Фамінічна, паводле слоў Марыі, стала самай хуткай дапамогай, шчасце яшчэ, што свёкар са свякроўкай жывуць з імі на адной вуліцы. Бацькі Марыі рэгулярна перадавалі прадукты, пакуль трымалі ў вёсцы сваю гаспадарку.

Зразумела, цяжка расціць трайнят, калі яшчэ і старэйшы малы. Сённяшнія маладыя мамы пры падтрымцы бабуль-дзядуляў з абодвух бакоў нярэдка стогнуць, што ночы не дасыпаюць. А што тут гаварыць, калі іх адразу трое, нарадзіліся маленькімі, крыху раней за тэрмін — з усімі наступствамі? Ды справілася ж, пераадолела многія і многія цяжкасці, перадольвае іх і цяпер. І не проста падняла дзяцей на ногі, выхавала іх працалюбівымі, душэўнымі, сапраўднымі людзьмі. Але пра гэта крыху пазней...

### АДНО ЦЭЛАЕ

Дзяўчынак назвалі Вера, Надзя, Люба. Яны падраслі і пайшлі ў школу, вядома, у адзін клас. 27 жніўня 2004 года ў нашай газеце быў змешчаны матэрыял са здымкам гэтых мілых першакласніц у прыгажэнных сукенках, якія пашыла да першага званка мама. Вялікая ўдача для сям'і, што гаспадыня цудоўна шые. Калі дочкі былі маленькія, новыя ўборы мама шыла ім да кожнага дня нараджэння. Тады малыя лічылі, што яны абавязкова павінны выглядаць аднолькава. Адзежак, якія моцна адрозніваліся б, не хацелі насіць наогул. Адной чы ім на свята падарылі тры кофтачкі, прыгожыя, не танныя, але... розныя. «Так і праваляліся, — з усмешкай успамінае мама, — не ўгаварыла іх апрануць».

Яны раслі як адно цэлае, гэтак жа трымаюцца і зараз. Дзяўчаты заўсёды разам, да нядаўняга часу ў іх нумар тэлефона быў адзін на траіх. І толькі нядаўна набылі яшчэ дзве сім-карты. Калі купляецца нейкая абноўка, і не ў трох экземплярах, а крыху розныя варыянты, то ўмовай пакупкі для адной стаНовіца адабрэнне дзвюх другіх сясцёр. У іншым выпадку рэч не набываецца. А калі мама шые, то можна і падабраць колер з фасонам, і падагнаць па фігуры.

Ды і не толькі ў вопратцы справа. Даўным-даўно педагог-псіхолаг у садку пакалазала Марыі Селех асаблівасці псіхалогіі блізнят на простым прыкладзе. Дзяўчынкам паасобку далі аднолькавыя фігуркі і папрасілі раскласці ў радок — так, як ім падабаецца. Усе як адна расклалі ў аднолькавым колеравым парадку, напрыклад: чырвоны, потым жоўты, сіні, зялёны. І да гэтага маці не асабліва настойвала, калі сястрычкі нечага не хацелі апранаць альбо купляць, а пасля таго эксперыменту і пагатоў.

У школе фактар іх еднасці, здаецца, улічваюць. Грамату за нейкія поспехі ім нярэдка выпісваюць адну на трох. Такую мы заўважылі ў альбоме: «Селех Вера, Надзея, Любоў узнагароджаны за ІІ месца па выніках рэспубліканскага конкурсу «Мая сям'я ў асобах і падзеях». У іх такіх грамат і падзячных лістоў вялікае мноства. Класны кіраўнік Ірына Рыгораўна Марчук сказала, што трайняты — яе апора ў класе: актыўныя, ініцыятыўныя, да таго ж вельмі добрыя дзяўчынкі. У конкурсах і розных школьных мерапрыемствах не толькі ўдзельнічалі, але і нярэдка атрымлівалі заахвочванні. І тады ўзнагароды займалі сваё пачэснае месца ў сямейным летапісе, які ў доме Селехаў спраўна вядзецца ужо многія гады.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)**

■ У вас будзе дзіця

*«ЗВЯЗДА» + АНТ*

# Вышукваецца... дом

**Беларуска-расійская рубрыка «У вас будзе дзіця» выходзіць на тэлеканале АНТ у рамках праграмы «Пакуль усе дома» ўжо больш як 3 гады. За гэты час 59 дзяцей, якія з розных прычын выхоўваліся ў інтэрнатных установах нашай краіны, змянілі месца жыхарства на бацькоўскія дамы, дзе іх любяць, клапоцяцца і ва ўсім падтрымліваюць. Летась да праекта далучылася і «Звязда» — у кожным выпуску «Сямейнай газеты» мы знаёмім патэнцыйных усынавіцеляў і апекуноў з малымі, якія больш за ўсё на свеце мараць пра сям'ю і ўтульны дом...**

Абаяльны 4-гадовы Арцём жыве ў Кобрыне, у SOS-дзіцячай вёсцы, куды пераехаў са сталічнага дзіцячага дома ў 2013 годзе. «Ён у нас акуратыст, любіць чысціню і парадак, з ахвотай дапамагае мне на



кухні, — расказвае выхавальніца Аксана Малышава. — З самага ранняга дзяцінства ён навучаны заўжды і з усімі вітацца, таму нават незнаёмыя людзі адразу звяртаюць на Арцёма ўвагу». А яшчэ ён, што дзіўна ў такім узросце, заўжды прадумвае свае ўчынкі і імкнецца знайсці выйсце са складаных сітуацый.

У дзіцячым садку на дружалюбнага, усмешлівага, развітога, дапытлівага і ўседлівага хлопчыка нарадавацца не могуць і часта прыводзяць у прыклад іншым дзецям. Але для поўнага шчасця Арцёмку вельмі патрэбны блізкія людзі і цёплы бацькоўскі дом, дзе можна ўкрыцца ад любых жыццёвых нягод. Можа, будучыя бацькі хлопчыка якраз цяпер чытаюць гэтыя радкі?

***Калі вы хочаце даведацца пра Арцёма больш, звяжыцеся са спецыялістамі Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі па нумары: (017) 284-71-51. Для тых, хто хоча ўсынавіць дзіця, на сайце videopassport.ru змешчаны відэазкурсы, падрыхтаваныя сумесна НЦУ і творчай групай праекта.***

■ Нататкі таткі



**Як чалавек, які вырас яшчэ з дзевяццю братамі і сёстрамі, і як дзядзька адзінаццаці пляменнікаў, да пэўнага часу я быў цвёрда пераканаены: пра бацькоўства ведаю больш чым дастаткова. Для мяне тут усё было проста: дзеці, безумоўна, гэта шчасце, але, у першую чаргу, адказнасць, бяссонныя ночы і мала часу на асабістае жыццё. Сёння, калі маёй дачцэ ўжо год і два месяцы, магу сказаць: усё гэта сапраўды так. Словы — тыя, толькі сэнс у іх ужо іншы.**

# ПЕРАВЕРНУТАЕ ЖЫЦЦЁ

## САМАЯ ПРЫЕМНАЯ АДКАЗНАСЦЬ

Калі рыхтуешся да бацькоўства, ты не выпускаеш з галавы думку пра адказнасць. «Ты абавязаны забяспечыць гэтага чалавека ўсім неабходным, даць яму ўсё найлепшае». Гэта аксіёма проста авалодвае тваёй свядомасцю. І, толькі стаўшы татам, ты разумееш: усё пералічанае — другаснае ў паняцці адказнасці. Да мяне гэтае разуменне ўпершыню прыйшло, калі жонка з малой яшчэ знаходзіліся ў бальніцы. Дачушцы няправільна паставілі крапельніцу. Не трапілі ў вену. Гэта прывяло да ацёку ручкі і шыйкі. Бедненькая, яна яшчэ не паспела нават усвядоміць, як усё вакол змянілася пасля нараджэння, а тут даваліся цярпець боль... Сваё першае выпрабаванне дачка вытрымлівала годна. Малая не плакала, але пры размове з жонкай у трубцы было чуваць, як яна цяжка дыхае. Я ніколі не думаў, што так можна адчуваць боль іншага чалавека. Тады я зразумеў, чаму так рана пасівела мая маці. Боль дзяцей — боль іх бацькоў, а адказнасць — не проста забяспячэнне ўсім неабходным. Гэта неабсяжная паняцце, пачатак якога — у сэрцы. З таго часу кожны вечар, цалуючы дачку перад сном, я прашу Усявышняга, каб Ён абараняў яе. Прашу: каб калі ёй і наканавана зведаць боль, то няхай лепш пашле гэта мне, нават памножаным шматразова.

Само ж асэнсаванне адказнасці за новае жыццё таксама прыходзіць нечакана. Я, напрыклад, дакладна магу назваць гэты момант. Калі маіх дзяўчат выпісалі з бальніцы і мы падымаліся ў сваю кватэру, недзе паміж другім і трэцім паверхам малая прачнулася і пачала варушыць ручкамі ў канверціку. Праз тканіну адчуў гэтыя рухі.

Не ведаю чаму, але менавіта ў тую хвіліну дакладна зразумеў: я адказны за чалавечка, якога няcу на руках. У гэты момант, на гэтай крутой лесвіцы і на ўсё астатняе жыццё.

Так, дзеці — вялікая адказнасць, але самая прыемная і хвалюючая, што можа быць дадзена чалавеку.

## РАМАНТЫКА БЯССОННЫХ НАЧЭЙ

Дзеці — гэта бяссонныя ночы. Напэўна, такая асацыяцыя з'яўляецца самай распаўсюджанай. Тут памылкі няма. Яшчэ ні адно дзіця не выгадавалася, не зладзіўшы свам бацькам «усяночную». Толькі першы час ты не спіш не ад таго, што дзіця плача, а ад таго, што хвалюешся за яго. Раптам прачнецца, а цябе няма побач? А раптам раскрыецца і яму будзе холадна? І такіх «раптам» набярэцца столькі, што кожную гадзіну ты будзеш прачынацца, каб праверыць, ці ўсё добра.

Бяссонных начэй сапраўды шмат. Толькі яны не падобныя на тыя, калі табе патрэбна быць у дарозе ці скончыць неадкладную працу. Вам калі-небудзь даводзілася да раніцы гуляць з каханым? Згадзіцеся, вы не адчувалі стомы. Так і ў гэтым выпадку. У такіх начах ёсць своя адметная рамантыка. Калі дачцэ не было яшчэ і месяца і колікі перашкаджалі сну, я клаў яе жывоцікам сабе на грудзі. Цяпло цела спрацоўвала, як грэлка, яно здымала спазмы, і малая супакойвалася. Яна ціхенька сапла і засынала, а я ляжаў, баяўся варухнуцца, нават дыханне запавольвалася так, што чуваць было, як б'ецца яе сэрца. Ад нерухомасці цела млела, хутка пачынаў адольваць сон, але перапыняць такі шчаслівы момант не хацелася.

Так, дзеці — гэта ночы без сну, але дзеці — гэта яшчэ і той энергетык, які дае бясконцы запас сілы і вытрымкі.

## НОВЫ ЦЭНТР СУСВЕТУ

Малое дзіця ў сям'і — як спушчаны якар для карабля. Пэўны час ты ўжо не можаш так лёгка сарвацца на сустрэчу з сябрамі ці ў падарожжа. Для кожнага выхаду з дому неабходна пралічваць цэлы шэраг абставінаў: надвор'е, час, месца і гэтак далей. Уражанне, што збіраешся ў космас. З другога боку, ты і сам ужо не імкнешся столькі часу праводзіць у кампаніях. Баішся прапусціць любую хвіліну, таму што ў ёй абавязкова будзе нешта адмысловае: пяшчотная ўсмешка, першы крок альбо новае слова. Ці можна гэта назваць абмежаваннем асабістага жыцця? Не, бо дзіця і становіцца тваім асабістым жыццём.

У юнацтве часта ўяўляў сабе, як буду татам. Ведаў: гэта будзе чымсьці незвычайным і эмацыйным. Быў пераканаены: дзеці — шчасце, якое пераварочвае тваё жыццё з ног на галаву. Падсвядома быў падрыхтаваны і да складанасцяў, але не чакаў, што нараджэнне дзіцяці дае крылы, якія ўздымаюць чалавека над перашкодамі і дапамагаюць несці любы цяжар адказнасці.

**Аляксандр АЛЕСІК**

■

# Вера, Надзея, Любоў, іх брат і бацькі

**(Заканчэнне.**
**Пачатак на 1-й стар. «СГ».)**

## ЛЕТАПІС СЯМ'І

У тоўстым альбоме, заўважыла, захоўваюцца нават ксеракопіі маіх газетных публікацый: і 1997, і 2004 года. Тут і самыя розныя адзнакі кожнага з членаў гэтага дружнага сямейства. Шматлікія дыпломы старэйшага сына Колі за спартыўныя дасягненні, працоўныя і армейскія адзнакі Івана Сцяпанавіча, як ужо гаварылася, самыя розныя знакі прызнання поспехаў Веры, Надзі, Любы. Менш за ўсё яе, Марыі, адзнак. Але ж зразумела, што за поспехам кожнага члена сям'і стаіць яе праца. «Адну работу робіш, — смяецца маці сямейства, — яшчэ тры вылазіць. Але ж мусіш усё рабіць. Сабе прыстойную сукенку пашыць проста часу не хапае».

І як яна ўсё паспявае?! Ну, хоць бы той жа альбом — гэта ж таксама яе рук тварэнне. Трэба было сабраць, абагуліць, прывесці да адзінай формы партрэты, біяграфіі, ілюстрацыі найперш дзядуляў і бабуль. Тут можна прачытаць, хто з іх дзе нарадзіўся, у якой сям'і, колькі дзяцей выгадаваў, дзе працаваў, якія працоўныя заслугі меў. Ёсць звесткі пра кожнага з дзядзькаў і цётак малодшага пакалення сям'і Селехаў. Ну, большасць старонак складае гісторыя іх сям'і ў храналагічным парадку, крок за крокам. Альбом працягваецца, наперадзе — не толькі новыя старонкі, але, відаць, і новыя тамы.



Уся сям'я ў зборы.



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Прыгажуні мама і дочкі за бабуліным ткацкім станком.

## ДОМ

У гэтай сям'і любяць адно аднаго, любяць свой дом, ствараюць і падтрымліваюць традыцыі. Іх дом па вуліцы Якуба Коласа выдзяляецца акуратнасцю, дагледжанасцю. Гэты дом Іван і Марыя будавалі шмат гадоў. Узводзіць жыллё сталі неўзабаве пасля таго, як пажаніліся. На момант нараджэння дачок шмат чаго патрабавалася яшчэ зрабіць. Тады нават мясцовая газета паспяшалася паведаміць, што маладой шматдзетнай сям'і выдзелілі субсідыю на будаўніцтва. Тым больш, што Іван службу праходзіў у Афганістане, яны крыху і спадзяваліся на сякую-такую падтрымку. Пайшла тады Марыя Селех у выканкам, пахадзіла з кабінета ў кабінет. Адны абнадзейвалі, другія раілі, каб не асабліва разлічвала, а адна чыноўніца заявіла: «Вас ніхто не прасіў нараджаць». З той пары Селехі нічога ні ў каго не прасілі. Залазілі ў даўгі, асвойвалі розныя будаўнічыя спецыяльнасці, калі рабілася зусім цяжка, прасілі бацькоў дапамагчы, але дом свой давялі да толку, абсталявалі, як самім падабаецца. А яшчэ зрабілі яго гасцінным, утульным... і цікавым.

## МУЗЕЙ

На другім паверсе, які ўтварае паддашак, Марыя з дапамогай сямейнікаў абсталявала сапраўдны музей вясковага побыту. Шчыра скажу, не ўсе этнаграфічныя куткі, куды звычайна водзяць дэлегацыі, могуць параўнацца з іх уласным сямейным музеем. Большасць яго экспанатаў склала маёмасць дзеда-гаспадара гэтага дома і прадзеда нашых герaінь. Калі паўстала пытанне разбіраць дзедаву хату, Марыя вывезла з гарышча ўсё. Нешта забрала з куфраў сваіх бабуль і бацькоў. І цяпер увесь цыкл сялянскага побыту ў рэчах размясціўся ў адным вялікім пакоі. І галоўнае, усё гэта сваё — яно памятае цяпло рук прабабуль і прадзедаў. Маё замілаванне выклікала, напрыклад, палатняная торбачка, з якою дзед Івана хадзіў у школу.

Тады ўсе насілі сшыткі ў падобных торбах, толькі захаваць названую рэч прыходзіла ў галаву далёка не кожнаму. Усе гэтыя збаны, ступы, вялікія плеценыя кашы, жалезныя прасы даводзілася сустракаць у многіх этнаграфічных кутках. А вось драўляны самаробны ложак, якому больш за сто гадоў, выглядае сапраўдным рарытэтам. На ім усё, як у пазамінулым стагоддзі: сяннік запаўняецца свежым сенам кожны год напярэдадні Калядаў. Засланы ложак саматканай бялізнай, упрыгожаны самаробнымі карункамі. Не так даўно ў Селехаў была госця з Францыі, дык папрасілася пераначаваць на гэтым ложку. І здзіўлялася, дзе толькі Марыя пазнаходзіла столькі бабуліных ручнікоў, абрусаў, вышытых сарочак! Яны размешчаны ўздоўж сцяны. Побач вісіць плеценая калыска. Ткацкі станок, дарэчы, у рабочым стане. А сама Марыя, аказваецца, умее ткаць, яе навучыла гэтаму маці. У куце прымасціліся драўляныя лапаты, якімі садзілі хлеб у печ. З цікавасцю даведваемся, што на Кобрыншчыне іх выкарыстоўвалі як абярэгі ў моцных грымоты.

**Адны абнадзейвалі, другія раілі, каб не асабліва разлічвала, а адна чыноўніца заявіла: «Вас ніхто не прасіў нараджаць». З той пары Селехі нічога ні ў каго не прасілі.**

Кожная музейная рэч мае сваю гісторыю. На наша пытанне, што за драўляная бочачка крыху непрывычнай формы, чуем адказ, што менавіта вось гэтая пасудзіна гарэлкі пайшла некалі на вяселле дзеда. На вялікім стале знайшлося месца значкам і пасведчанням да іх аб тым, што бацька быў ударнікам працы. А чырвоная стужка з надпісам «Член клуба пяцігісячніц» сведчыць, што маці Марыі была перадавой даяркай. Пра любы экспанат можа расказаць не толькі стваральніца сямейнага музея, але і кожная з дачок і сын. Для іх і стараюцца Марыя Сцяпанаўна і Іван Сцяпанавіч: каб помнілі, шанавалі, ганарыліся.

## УСЕ РАЗАМ

Старэйшы сын Мікалай нядаўна прыехаў дадому пасля сесіі, хлопец скончыў трэці курс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі. А ў дзяўчынак гэтае лета вельмі складанае і адказнае: спачатку экзамены ў школе, потым — тэсціраванне і паступленне. Схільнасці ва ўсіх розныя. Надзя, напрыклад, моцная ў гуманітарных дысцыплінах, займала прызавыя месцы ў алімпіядах па гісторыі і грамадазнаўстве, Вера больш любіць інфарматыку, але да тэстаў усе рыхтуюцца сур'ёзна і адказна.

Падрыхтаваліся дзяўчынкі і да першага ў сваім жыцці балю. Мама пашыла ім выпускныя сукенкі. Калі адна з сясцёр па нашай просьбе памерала ўбор, фотакарэспандэнт не стрымаўся і ўсклікнуў: «Нібы з французскага салона!». І да гэтага больш нічога нельга дадаць. А калі ўявіць іх з прычоскай і макіяжам, то перад вамі паўстануць сапраўдныя прыгажуні. Яны і ў рэтрасукенках, якія мама пашыла да апошняга званка, таксама выглядаюць стыльна. Як мы змаглі даведацца пазней, не толькі прыгажуні гэтыя выпускніцы, яны яшчэ і добрыя гаспадынькі. Мама з ранку была на працы, а ім сказала прыгатаваць дэсерт. Калі ж нас запрасілі за стол, адмовіцца было немагчыма! Каштавалі і сведчым: торт, піражкі, бліныы з тварагом дзяўчаты гатаваць умеюць. А яшчэ яны ўмеюць рабіць усё па доме і агародзе. Вясковы дзядуля зараз застаўся адзін, гады і здароўе патрабуюць, каб да яго наведваліся два разы на тыдзень. Вера, Надзя, Люба разам з мамай і татам часта едуць да дзеда і там таксама ўсё робяць.

Яшчэ калі былі на другім паверсе ў маленькім пакойчыку побач з музеем, дзе захоўваюцца шматлікія вышыванкі мамы і дачок (і гэта яны ўмеюць), мімаходзь пацікавілася, ці былі яны хоць раз усе разам на моры, на нейкіх курортах. «Неяк не выпадала, — адказала Марыя. — Можа, як-небудзь потым...»

Ведаю, аб чым сціпла прамаўчала суразмоўніца: сёння яны не могуць дазволіць такі адпачынак. Але гэта не галоўнае. Галоўнае — згода і разуменне, здароўе Надзі, якое патрабуе пастаяннай увагі, спадзяванні і планы на будучыню. На светлай прасторнай кухні, дзе пахла печывам і дамашняй утульнасцю, думалася, што вось гэтыя простыя людзі рабочых прафесій здолелі пабудаваць шчаслівую сям'ю, стварыць у доме атмасферу асаблівай інтэлігентнасці. У падмурку гэтага будынка, несумненна, талент Марыі як гаспадыні і маці, грунтоўнасць і аўтарытэт Івана як бацькі, падтрымка родных і блізкіх.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Кобрынскі раён.*

■ Першы раз

# ВЫПРАБАВАННЕ... ЛЕТНІКАМ

## Пра што трэба пагаварыць з малым, адпраўляючы яго ў самастойнае падарожжа, і да чаго рыхтавацца маме з татам, якія застаюцца дома?

**Рашэнне адправіць дзіця ў летні лагер першы раз — сапраўднае выпрабаванне для бацькоў. Трывога і страх пачынаюцца толькі ад адной думкі, што малы будзе пару тыдняў без апекі роднага чалавека. Але адпачынак у летніку для многіх хлопчыкаў і дзяўчынак — больш чым проста канікулы. Гэта сапраўдная самастойнасць, дзеці раскрываюцца ў лагеры лепш, чым у звычайным жыцці. Там няма выдатнікаў і троечнікаў, няма адказаў каля дошкі. У лагеры жывыя чалавечыя зносіны круглыя суткі.**

**Пра тое, як зрабіць адпачынак у летніку максімальна спакойным і камфортным для малых і бацькоў, расказала псіхолаг дзіцячага цэнтра «Дарвік» Святлана АНІШЧАНКАВА.**



### У ЯКІМ УЗРОСЦЕ МОЖНА АДПРАЎЛЯЦЬ ДЗІЦЯ Ў ЛЕТНІ ЛАГЕР?

Тут усё вельмі індывідуальна. Некаторыя дзеці могуць самастойна жыць у лагеры ўжо з 7 гадоў, ёсць «хатнія» малыя, якія гатовы да такога адпачынку толькі ў дзесяць. Ёсць дзеці, якім увогуле не падабацца адпачываць удалечыні ад родных.

— Безумоўна да кожнага малога неабходны індывідуальны падыход, — гаворыць Святлана Анішчанкава. — Калі дзіця па сваіх асаблівасцях развіцця не гатова мець паўнавартасныя кантакты ў соцыуме (а гэта заўсёды відаць па канфліктах у дзіцячым садку і ў школе), то адпраўляць такіх адпачываць у летнік будзе памылкай. Звычайна гэта дзеці сарамлівыя, замкнёныя, больш трывожныя ці наадварот гіперактыўныя. Такія малыя ў летніку будуць атрымліваць негатыўны вопыт, і адпачынак не прынясе ім карысці.

### ШТО НЕАБХОДНА ЎМЕЦЬ ДЗІЦЯЦІ, ЯКОЕ ЕДЗЕ Ў ЛЕТНІК?

Па-першае, дзіця павінна ўмець даглядаць сябе. Самастойна мыцца, мыць адзенне, адзявацца і расчэсвацца. Па-другое, дзіця важна навучыць сачыць за сваімі рэчамі. У лагеры шмат дзяцей, па некалькі чалавек у пакоі, а за парадкам мала хто ўмее сачыць. Таму згубіць рэчы там вельмі лёгка.

— Калі дзіця не валодае элементарнымі бытавымі навыкамі, то лепей пачакаць з самастойным адпачынкам. За тыдзень немагчыма навучыць малое абслугоўваць сябе, таму правільным вырашэннем будзе адправіць дзіця ў летнік на наступны год, — лічыць спецыяліст.

**ПРЫКЛАДНЫ СПІС ПАТРЭБНЫХ РЭЧАЎ**

- Бейсболка або панамка.
- Шорты, футболкі, сукенкі, джынсы.
- Ніжняя бялізна.
- Вятроўка і світар для халаднаватага надвор'я.
- Спартыўны касцюм.
- Купальнік або плаўкі, сланцы, шапачка для басейна (у тым выпадку, калі ёсць дзе купацца).
- Прадметы асабістай гігіены: зубная паста і шчотка, мыла з мыльніцай або вадкае мыла, мачалка, шампунь, грабянец, ручнік банны і для ног, туалетная папера, дзіцячая касметыка.
- Абутак спартыўны, выхадны і на кожны дзень, а таксама сланцы.
- Сродкі ад камароў.
- Прыгожае адзенне для дыскатэкі і святочных вечароў.
- Вільготныя сурвэткі і насоўкі.
- Фотаапарат.
- Пенал і нататнік.
- Кнігі.

### УМЕННЕ ЗВЯРТАЦЦА ПА ДАПАМОГУ

Звычайна кожную групу дзяцей суправаджае або курыруе кіраўнік. Прасачыце, каб у вашага дзіцяці быў запісаны тэлефон гэтага чалавека, каб яно ведала і не баялася звярнуцца да яго, калі нешта здарыцца. Яшчэ малому трэба запомніць галоўнае правіла: калі ўсё ж нешта здарылася — адразу звяртацца да дарослых! Калі нехта ўпадзе, паб'ецца, страціць грошы ці яго пакрыўдзяць — усё гэта падстава звярнуцца па дапамогу.

— Патрабаваць ад дзіцяці ідэальных паводзін проста бессэнсоўна,— гаворыць Святлана. — Бацькам трэба проста прыняць тое, што непазбежны выпадкі, калі ў вашага малога ўзнікнуць невялічкія праблемы. Менавіта яны даюць дзецям ключ да пазнання жыцця. Напрыклад, сіняк пад вокам дасць яму разуменне, што не заўсёды трэба лезці на ражон, і, магчыма, у наступны раз ён будзе шукаць выйсце з канфлікту іншым шляхам. Калі ж малы згубіць свае грошы, то горыч страты падштурхне яго быць больш уважлівым. Гэта натуральны жыццёвы вопыт.

### ПРАВІЛЫ ДЛЯ ЎСІХ

Загадзя раскажыце дзіцяці пра тое, што ў лагеры ўсе жывуць і адпачываюць па пэўных правілах. Яны могуць адрознівацца ад жыцця дома, але іх трэба абавязкова выконваць. Напрыклад, дзецям у летніку не дазваляецца заплываць на глыбіню, нават калі малы пра сябе ведае, што ўмее вельмі добра плаваць, і нельга самастойна сыходзіць за межы тэрыторыі летніка, нават калі дзіця заўсёды гуляе самастойна. Растлумачце і абмяркуйце з дзіцем, хто і навошта прыдумаў розныя правілы і чаму іх трэба выконваць.

— Пэўныя правілы дапамагаюць дзіцяці гарманічна развівацца псіхалагічна і эмацыянальна, — упэўнена спецыяліст. — Дзеці, якія растуць у сем'ях, дзе парушана іерархія, часта бываюць проста дэзадаптаванымі ў грамадстве. Вялікі плюс адпачынку малых у летніку якраз у тым, што яны вымушаны падпарадкоўвацца дарослым. Такі вопыт дапамагае ў будучыні адаптавацца ў калектывах.

### ЗНАЁМІМСЯ І ЗАВОДЗІМ СЯБРОЎ

Звычайна дзеці вельмі лёгка знаёмяцца. Але ў некаторых усё ж могуць узнікнуць цяжкасці.

Скажыце школьніку, што шмат хто ў яго групе адчувае тое, што і ён. Таму можна смела выбіраць сабе сябра, а той будзе толькі рады.

Не забудзьцеся згадаць, што калі яго прапанова (напрыклад, пайсці разам пагуляць) не была ўспрынята з захапленнем, гэта не падстава крыўдзіцца, а тым больш злавацца.

— Яшчэ адзін плюс знаходжання малых перыядычна без бацькоў — гэта паніжэнне сацыяльных асацыяцый, — разважае псіхолаг. — Бацькі часта дыктуюць сваім малым, з кім і як сябраваць. Для дзіцяці, якое з цяжкасцю праходзіць наладжванне некаторых асабістых адносін, вельмі важна самому выбраць сабе сябра. Выходзячы з-пад апекі дарослых, малыя маюць больш шанцаў навучыцца сябраваць па-сапраўднаму.

### ТРЫМАЙЦЕ СУВЯЗЬ

Неабходна стварыць дзіцяці адчуванне надзейнага «тылу», запэўніць яго, што ў любы момант ён зможа звязацца з вамі. Дайце яму з сабой мабільны тэлефон. Калі дзіця маленькае, тэлефон можа захоўвацца ў выхавацеля. Абгаварыце час званкоў. Паклапаціцеся пра тое, каб у дзіцяці былі запісаны ўсе вашы каардынаты.

— Да сітуацый, калі дзіця тэлефануе з летняга лагера з нейкай скаргай, дарослым трэба ставіцца адэкватна, — раіць спецыяліст. — Зразумела, малога спачатку трэба падтрымаць, а ўжо потым расказаць яму, што з любой праблемы ёсць выйсце, і не адно. Дарэчы, у гэтым павінны быць упэўнены не толькі дзеці, але і дарослыя.

### ГАДЖЭТЫ І ГРОШЫ

Растлумачце свайму дзіцяці, што калі ён бярэ ў лагер планшэт, смартфон або камп'ютар, то ён сам павінен ахоўваць сваю дарагую ўласнасць. А можа, лепш наогул не браць?

Грошы даваць з сабой давядзецца ў любым выпадку. У некаторых летніках грошы захоўваюцца ў кіраўніка групы, некаторыя дзеці вырашаюць распараджацца капіталам самі. Раскажыце малому, на што і як траціць грошы. Можна, дарэчы, раскласці грошы на асобныя «купкі», распісаўшы па днях, якую суму яму можна патраціць. Так дзіцяці будзе лягчэй не патраціць грошы за адзін дзень.

— Тэма грошай заўсёды вострая, — лічыць Святлана. — А ў малых часта проста няма элементарнага вопыту «зносін» з грашыма. Дзіця звычайна дзейнічае прымітыўна, яму захацелася — ён набыў. Таму ўвогуле даваць вялікія сумы не варта: буйная сума на доўгі тэрмін будзе размеркавана дзіцем няправільна.

### АДАПТАЦЫЯ

Адаптацыя на новым месцы звычайна доўжыцца каля тыдня. Гэта значыць званкі са слязамі могуць паступаць у першыя 7 дзён.

Сэрца маці ў гэты момант ірвецца на часткі, і першы парыў — забраць дзіця з летніка. Але, паверце, хутчэй за ўсё, праз пару дзён дзіця абвыкне, уцягнецца, а да канца змены не захоча вяртацца дадому. Так што проста размаўляйце з малым спакойна, запэўніце яго, што сумаваць па дому — гэта нармальна. Распытайце дзіця, што цікавага ёсць у лагеры. Старайцеся размаўляць з ім не часцей за два разы на дзень, інакш дзіця ад вас так і не «адарвецца».

Але ўсё-такі слухайце дзіця ўважліва, і ў выпадку сумненняў ператэлефануйце кіраўніку групы.

— Здараецца, што бацькі свае эмоцыі несвядома накладваюць на эмоцыі дзяцей, — гаворыць псіхолаг. — Часта страх і трывожнасць маці, якая адарвала ад сябе любімае дзіця, перадаюцца малому, і тады ён вымушаны паводзіць сябе так, як чакае ад яго самы дарагі і любімы чалавек. Таму бацькам трэба быць вельмі ўважлівымі ў праяўленні сваіх эмоцый і вучыцца давяраць сваім малым.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ** ■

■ Вазьму твой боль...

# ПРЫГОЖЫЯ ТАКСАМА ПЛАЧУЦЬ




**Прыгожыя людзі паміраюць часцей. Такое назіранне я вывела за час валанцёрскай працы ў дабрачынным руху «Клуб 5000». Яшчэ ў свой першы візіт у Цэнтр дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі заўважыла: якія там прыгожыя дзеці! Глянеш на малечу: валосікі выпадаюць ад хіміятэрапіі, пасярод галавы — шрамы ад аперацыі, а вочы сінія-сінія, вялікія-вялікія, і вейкі, што яшчэ не паспелі выпасці, падкручаныя, як на плойку.**

І калі такога прыгажуна не стане, гора павялічваецца ў маштабе. Прыгожых больш любяць, іх больш шкадуюць.

Калі я знаёмлюся ў бальніцы з чарговым прыгажуном, то міжвольна лаўлю сябе на думцы: «Навошта ты такі прыгожы? Вашаму брату тут не шанцуе». Безумоўна, гэта не так. Мае прымхі і суб'ектыўныя назіранні не маюць ніякіх афіцыйных падстаў. Але выснова застаецца: прыгажосць — гэта не панацэя.

У анкацэнтры сапраўды вялікая канцэнтрацыя прыгожых людзей. Гэта не азначае, што яны хварэюць больш за непрыгожых, але азначае, што яны таксама хварэюць. Прыгажосць не ратуе ад немачы і не пазбаўляе ад пакут.

Абмяркоўвала толькі што з сяброўкай, як мы не прымаем новых пасій дзяўчат з нашай кампаніі. Як раўнівая маці не хоча ладзіць стасункі з зяцем, ёй здаецца, што крывіначка вартая лепшага, а ён падэшвы яе не варты. Так і мы бачым з сяброўкай некага іншага, не такога плюгавенькага, не такога маўклівага, не такога скваппнага, не такога... Але неўзабаве ўсё складваецца. І на нашых вачах нараджаецца ідэальная пара, потым — ідэальная сям'я, ідэальны соцыум.

А па суседстве з болем, крыкам і крыўдамі рвецца па швах іншая сям'я. Вось яны з самага пачатку падыходзілі адно аднаму. Ім зайздросцілі. Ім наракалі шчаслівую будучыню. Гэта была прыгожая пара. Але прыгажосць не панацэя.

Нядаўна я пазнаёмілася з ідэалам прыгажосці. Дзяўчына — як з карціны. І тварык свяціцца, і кожная рысачка прадумана прыродай, і фігурка тачоная, і прапорцыі, і залатое сячэнне. Бывае ж так: усе жаночыя мары ўвасобіліся ў адным канкрэтным чалавеку. Яна да ўсяго яшчэ і разумная, добрая, шчодрая, забяспечаная. Жывi — шыкуй, ратуй свет прыгажосцю.

Але надышоў час свету самому ратаваць прыгажосць. Прыгажосць закахалася, а ёй лапшу на вушы вешалі. Прыгажосць замуж сабралася, а ёй здраджвалі. Прыгажосць дзіця пад сэрцам носіць. А недзе на іншым канцы свету яшчэ адна прыгажосць (а, можа, і не вельмі) носіць дзіця ад таго ж самага таткі.

Вось табе і раз. Прыгажосць ёсць, а шчасця няма. Несправядліва, крыўдна. Але прыгажосць не панацэя.

Ведаю яшчэ адну прыгажосць. Яе шмат хто ведае. Яна знакамітая. І добрая, мілая, разумная, эрудзіраваная, моцная, умелая, чулая... Дзесьці мы гэта ўжо бачылі. Усё пры ёй. У яе закахана паўсвету мужчын. Яе любы з радасцю ашчаслівіць. А яна кахае толькі аднаго. Таго, хто не здолеў зрабіць яе шчаслівай за некалькі гадоў сямейнага жыцця. Прыгожыя таксама плачуць.

Парадокс — гэтае ваша каханне. І прыгажосць — таксама парадокс. Яна ёсць, а толку з яе няма.

Вось таму мая сяброўка Марына — яшчэ тая прыгажуня — на любую цяжкасць, канфлікт, незразумеласць мае адзін агульны адказ: «Я бландзінка, што з мяне возьмеш?» Яна паставіла прыгажосць сабе ў абарону, на службу. Бландзінкі — яны ж лялькі, яны ж бязглуздыя, думаць не ўмеюць. Толькі ўборы прымяраць ды грошы траціць — гэта яны могуць!

І Марына цудоўна спраўляецца з роляй бландзінкі. І ніколі не падумаеш, што яна кіруе цэлым калектывам, што яшчэ ў «ліхія 90-ыя» падымала ўласны бізнес, што дыпламатызму ў яе вучыцца нават дыпламатам можна, што яна горы варочае і такі вопыт мае за плячыма, што брунеткам і не снілася. Яна навучылася карыстацца сваёй прыгажосцю, знайшла ў ёй выгаду.

Прыгажосць — гэта не панацэя. З ёй трэба дамаўляцца, да яе трэба шукаць падыход, з яе трэба сокі выціскаць, вяроўкі віць. Прыгажосць цяпер не тая пайшла. Не хоча ратаваць свет. Кажа, няхай свет мяне сам ратуе. Бо я кволая і безабаронная. Бо нават з дабрадзейнасцю разам мы не сіла. Нас раздавіць — як арэх раскусіць. Не зайздросціце нам. Прыгажосць не панацэя.

Шукайце лепш прыгажосць там, дзе яе няпроста знайсці. Як казаў да Вінчы, нават самая маленькая кошка — гэта твор мастацтва. І не загубіце прыгажосць. Ёй яшчэ свет ратаваць.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА, заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000»** ■

# ПІРОГ АД ІРЫНЫ НАРБЕКАВАЙ

**У дванаццацігадовым узросце мінская школьніца Ірына НАРБЕКАВА сыграла адну з галоўных роляў у фільме для дзяцей «Зімародак». Фільм расказваў пра тое, як дзяўчынка Зоя і два яе сябрукі-аднакласнікі шукалі партызанскага героя-падрыўніка па мянушцы Зімародак, а ў рэшце рэшт знайшлі свайго настаўніка біялогіі, якога яны не вельмі слухаліся на ўроках. Колькі разоў у сваім дзяцінстве і юнацтве прадстаўнікі майго пакалення глядзелі гэтае захапляльнае кіно!.. Фільм «Зімародак», які зняў кінарэжысёр Вячаслаў Нікіфараў, стаў знакавым у лёсе Ірыны. З яго распачалося яе творчае жыццё. Нядзіўна, што пасля школы Ірына паступіла вучыцца ў Мінскі тэатральна-мастацкі інстытут, пасля заканчэння якога атрымала накіраванне ў Тэатр кінаакцёра.**
**Сёння ў творчым багажы Ірыны Нарбекавай — больш за трыццаць роляў, якія яна сыграла на тэатральнай сцэне, і не менш за шэсць дзясяткаў цудоўна сыграных роляў у кіно. Апошнім часам артыстка шмат здымаецца ў кінафільмах і серыялах. Жаночыя вобразы, якія яна стварыла ў фільмах «Спакуса», «Настасся Слуцкая», «Жураў», «Моцная слабая жанчына», «Дунечка», «Адваротны бок Месяца», «Варажба на свечках», «Знахарка» і іншых, зрабілі Ірыну вядомай. А пасля ўдзелу ў тэлевізійнай праграме «Давай пажанімся!» у якасці вядучай — проста знакамітай. Яе пазнаюць на вуліцах, у крамах, просяць аўтографы... Я таксама пры сустрэчы звярнулася да яе з просьбай — даць мне... свой фірменны рэцэпт, а заадно расказаць пра свае кулінарныя схільнасці...**



Як вядома, многія творчыя людзі не прыстасаваны да побыту, іх не цікавяць хатнія і тым больш кухонныя справы — усе свае намаганні яны накіроўваюць на творчасць... Таму, прызнацца, мне было вельмі цікава, а як ставіцца да кухні папулярная артыстка тэатра і кіно Ірына Нарбекава?..

— *Думаю, што ўсё залежыць ад таго, у якім асяроддзі творчы чалавек выхоўваўся... Мне гэтыя ўменні даліся лёгка. Мае стрыечныя браты недарэмна клікалі мяне «маленькая гаспадыня вялікага дома». У дзяцінстве я была ўважлівая, учэпістая, за ўсім назірала, усё запамінала... І калі мы паехалі ў першую экспедыцыю на кіназдымкі фільма «Зімародак», мама спакойна даручала мне схадзіць у краму і купіць кавалак мяса ці «цукровую» костачку, каб зварыць боршч. Я ўжо тады ў гэтым разбіралася. Мне спадабалася назіраць, як пякуць пірагі, гэта адбівалася ў маёй памяці... І калі я выйшла замуж, то ўсё ўмела, але муж мяне спецыў, таму што сам шыкоўна гатаваў. А я крышку была збоку ад гэтага працэсу, але добра разумела: сёння ён саліруе, а заўтра, магчыма, мне давядзецца. Жанчына заўсёды павінна быць гатовай штосьці прыдумаць на кухні... Мяне і мама так вучыла: «Госць на парог — нясі хутчэй на стол пірог». Гэта значыць, што ў нашым доме не было такога, каб не было чым пачаставаць чалавека, апроч ячні. Нельга ўзнасіць ежу да нябёсаў, але і нельга прыніжаць яе значэнне... І калі да мяне прыходзяць госці, нярэдка здзіўляюцца: «Гэта вы ўсё згатавалі?.. А мы думалі, што вам каву ў пакой прыносяць!»*

Ірына Нарбекава нарадзілася і вырасла ў сям'і служачых. Бацька яе, па адукацыі энергетык, працаваў на заводзе Кастрычніцкай рэвалюцыі. Маці — статыстык... Між тым, як аказалася, прозвішча Нарбекава — знатнае, і род гэты знатных каранёў.

— *Ведаеце, мне замінае пыхлівасць, але незадоўга да сваёй смерці бацька прызнаўся, што яго маці — па прозвішчы Семяндзяева — была стаўбавая дваранка. Бацька заўсёды былі ўласцівы вытанчаныя манеры, ён быў педантычны, ахайны ва ўсім — як ён сядзеў, як ён еў, як апранаўся, як сачыў за сваімі пазногцямі... Было відаць, што ён родам з інтэлігентнай сям'і...*

Але гэты факт ніякім чынам не паўплываў на дзяцінства Ірыны Нарбекавай. Звычайная савецкая сям'я, якой добра было вядома, што такое жыць ад зарплаты да зарплаты.

— *Мы раслі ў 1970-я гады, і для нас з сястрой вялікія святы былі — 1 Мая, 9 Мая... Уранку мы збіраліся і ішлі на дэманстрацыю ці на парад. І ў кожным месяцы стаялі кіёскі, там прадаваліся зефір, сухая каўбаса — страшэнны дэфіцыт на тых часах. Часам мама прыносіла «заказы» ў пакетах — шпроты, чорную ікру, чырвоную ікру... Гэта было свята!.. І была радасць прадчування свята — флажкі, зялёныя галінкі, паветраныя шары, і абавязкова штосьці смачнае сёння купяць!..*

*Мая бабуля з нічога магла згатаваць усё. Ніколі не забуду пах яе булак!.. Новы год у нас — гэта былі ёлка, мандарыны і бабуліны плеценыя булкі з карыцай. Ах, гэты пах і хрумсткая скарыначка!.. А бабулін кампот!.. Божа!.. Яна гатавала геніяльна — са звычайных прадуктаў, і гэта пры тым, што сям'я ў яе была вялікая — чацвёра дзяцей. А потым яшчэ мы з'явіліся — унукі... І ўсе бабуліны дзеці ўмелі смачна гатаваць ежу. Памятаю, на Новы год і іншыя вялікія святы расцягваліся сталы і на іх выстаўляліся розныя хатнія салені-варэнні...*

Вядома, дзяўчынка, якая здымалася ў кіно, шмат ездзіла па краіне, жыла ў розных гарадах, магла назіраць за жыццём іншых людзей і пераймаць ад іх усё найлепшае. Але для Ірыны ўзорам для пераймання, перш за ўсё, былі блізкія людзі.

**Мая бабуля з нічога магла згатаваць усё. Ніколі не забуду пах яе булак!.. Новы год у нас — гэта былі ёлка, мандарыны і бабуліны плеценыя булкі з карыцай. Ах, гэты пах і хрумсткая скарыначка!..**

— *Мой дзядзька жыў у Гродне, працаваў у выканкаме... Гэта яго сыны клікалі мяне «маленькая гаспадыня вялікага дома». Дзядзька быў хворы на ныркі, і мая цётка Рыта гатавала яму ўсё дыетычнае. І ўсё было смачнае... Вось у іх сям'і быў сапраўдны культ ежы... Я шмат чаму навучылася ад цёткі: як гатаваць, як сервіраваць стол, як падаваць стравы... А якая чысціня была ў яе на кухні!.. Цётка гаварыла, што мала смачна гатаваць, трэба яшчэ з настроем мыць посуд і трымаць працоўны стол гаспадыні заўсёды чыстым. І перш, чым гатаваць страву, трэба спачатку падрыхтаваць стол: тут у цябе павінна стаяць мука, тут — соль, тут — цукар... Тады ўсё бліскуча атрымаецца.*

*У маладосці я марыла, што калі ў мяне будзе свой дом ці свая кватэра, то абавязкова куплю сталовы сервіз на 12 персон. У цэнтры стала буду ставіць супніцу са смачным супам. І абавязкова набуду кейс з лыжкамі, нажамі і відэльцамі (потым такі кейс мне муж прывёз). Мне заўсёды хацелася, каб стол быў прыгожа сервіраваны, а не накрыты рознакаліберными талеркамі і лыжкамі... За прыгожа накрытым сталом нават проста папіць чаю будзе смачна.*

Дарэчы, Ірына Нарбекава вельмі любіць чай. Розны — і зялёны, і чорны, і каркадэ, і з мятай, і з бергамотам, і з рознымі іншымі дабаўкамі. У яе свой сакрэт прыгатавання смачнага напою.

— *Спачатку я апараю чайнік кіпнем. Потым сыплю чай, адразу наліваю поўны чайнік кіпенем і накрываю спецыяльна сшытай цёплай накрыўкай. І ён пэўны час так стаіць.*

*Дзе б я ні была, адусюль вязу дадому чай. Нядаўна адпачывала ў Егіпце, прывезла адтуль каркадэ. Ён вельмі смачны і карысны — ціск рэгулюе... Трэба класці ў кубачак толькі 5 пялёсткаў. Была ў Англіі, ва Уэльсе, там чай па-іншаму п'юць: насыпаюць паўкубка і заліваюць малаком... А зусім нядаўна была на кіназдымках у Ташкенце, прывезла адтуль піялы. Даведалася там: калі табе падаюць чай, ні ў якім разе нельга перадаваць яго далей. Гэта табе далі піялу, і ты павінен сядзець, піць з яе зялёны чай і атрымліваць задавальненне.*

*Колькі класці чаю ў чайнік? Як у тым анекдоце: памірае стары яўрэй, які ўмеў смачна заварваць чай. Дзеці яго просяць: «Тата, скажы сакрэт смачнага чаю!» Стары расплюшчыў адно вока і ціха гаворыць: «Дзеці, не шкадуйце заваркі!»*

Мы сядзім на невялікай, але вельмі ўтульнай кухні артысткі, і Ірына частуе мяне сапраўды смачным, духмяным чаем. І пірог з яблыкамі, які гаспадыня спякла да чаю, таксама вельмі смачны.

— *Ніколі не прыпісвала сабе чужых рэцэптаў. Пячы гэты пірог мяне навучыла падчас адной з кінаэкспедыцый артыстка Галіна Рыгораўна Рагачова, на жаль, ужо нябожчыка.*

*Нядаўна да мяне на лецішча прыязджала сяброўка і прывезла з сабой пірог. Я паспрабавала яго і сказала: «Які смачны!.. Як гэта цеста называецца?» Сяброўка адказвае: «Яно называецца — цеста ад Ірыны Нарбекавай». Я здзівілася: «Няўжо?!.» А сяброўка мая — з Краснаярска. Яна навучыла мяне ляпіць сібірскія пельмені, пячы піражкі з розным начыннем, гатаваць беляшы... А я навучыла яе пячы вось гэты пірог. І ўсіх сваіх сяброў і знаёмых таксама навучыла, бо некалі пякла яго пастаянна. А потым падумала, што трэба захоўваць фігуру, і на доўгі час пра яго забылася...*

*А пірог — просты і смачны. Гатаваць яго лёгка і хутка, асабліва калі наб'еш руку!..* (Глядзіце рэцэпт.)

Між іншым, у Ірыны на кухні заўсёды пад рукой прыгожы сшытак, куды яна запісвае ўсе рэцэпты смачных страў, якія паспрабавала дзесьці ў гасцях. Яна ніколі не сароміцца спытаць у гаспадароў, як што прыгатавана. Усе рэцэпты падпісаны паіменна: «Пірог ад Галіны», «Печыва з варэннем з чорных парэчак ад Святланы», «Асарці з гародніны ад Лілі», «Салёныя агуркі ад свекрыві»... А цяпер у гэты сшытак ужо дадаюцца кулінарныя рэцэпты дваццацігадовай дачкі. Напрыклад, «Пірожнае «Бульбачка» ад Сашы»...

Апошнім часам у рацыёне сям'і Ірыны Нарбекавай з'явіліся новыя стравы — дачныя.

— *Я купіла дачу пяць гадоў таму. Нават не ўяўляла, што ў мяне з'явяцца новыя здольнасці — будаўніка, гаспадара, садавода-агародніка... Мне так падабаецца купляць і садзіць дрэвы, кветкі, расліны!.. Ужо пасадзіла хвойнікі, зрабіла клумбы, газон, паставіла арэлі... Грошай не шкадую.*

*У гэтым годзе ў мяне на дачы з'явіўся парнік, і там на маленькіх агурочках — ужо па тры лісцікі!.. Гэта так цікава — у цябе штосьці вырасла! А каб вы бачылі, які шыкоўны кроп у мяне ўрадзіў у мінулым годзе! Сёлета ж і радыска свая ёсць, і салата, і шчаўе, і кроп, і пятрушка, і часнок, і вялікая градка зялёнай цыбулі!..*

*Я вельмі люблю на дачы гатаваць халаднік з буračкоў і шчаўе халоднае... Агуркі вырастуць — буду салiць!.. Вельмі люблю кабачкі, гатую з іх аладкі. Раблю рулецікі з баклажанаў — з часначком і зелянінай... Дарэчы, ведаю сакрэт, як доўга захоўваць часнок: не абразаць сцябліны, а паставіць яго «на ножках» у вазу ці ў шклянку — бычыцца букет.*

*Да мяне на дачу прыязджаюць мае родныя і самыя блізкія сябры. Улетку мы ходзім па грыбы, адпачываем у садку сярод экзатычных кветак, увечары сядзім на лаўцы, спяваем песні, слухаем спевы птушак, п'ём гарбату з зёлкамі і маім любімым пірагом... Я вельмі ўсё гэта люблю і цаню...*

**Падрыхтавала Тамара БУНТА.**

<u>У кулінарны блакнот:</u>

## ПІРОГ ДА ЧАЮ

*__Спатрэбіцца:__ для цеста — 1/3 пачка дражджэй, 1/3 пачка маргарыну, 1 шклянка малака, 3 ст. лыжкі цукру (гэта для пірага з салодкім начыннем, а з іншым начыннем — 1 ст. лыжка цукру), крыху солі, 4 шклянкі мукі, 1 жаўток, 30 г масла; для начыння — любое густое варэнне, джэм, яблыкі, тушаныя капуста, цыбуля, грыбы — да густу.*

Дрожджы развесці ў невялікай колькасці (30 г) ледзь цёплага малака, змяшанага з невялікай колькасцю (1 ч. лыжка) цукру, накрыць чым-небудзь цёплым і пачакаць, каб яны крыху падышлі. Растапіць маргарын, крыху астудзіць, дабавіць у яго дрожджы, якія ўжо падышлі, потым уліць туды астатняе малако, дабавіць цукар, соль, муку і замясіць цеста.

Замешанаму цесту даць 10 — 15 хвілін «адпачыць», а потым разрэзаць яго напалам і раскачаць качалкай на два пласты. Змазаць бляху алеем, пакласці на яе адзін пласт. Зверху на пласт акуратна пакласці начынне, накрыць другім пластом і сашчапіць іх.

Пірог упрыгожыць узорам, змазаць узбітым жаўтком, потым паставіць у духоўку і выпякаць 30 хвілін пры тэмпературы 180 градусаў.

Пасля таго, як пірог спячэцца, змазаць яго зверху маслам, накрыць пергаментам або сурвэткай і даць яшчэ крыху пастаяць.

Смачна есці!

## АХ, ЛЕТА!..

**Лета — дачная пара, а на дачы зусім не хочацца есці нічога гарачага і сытнага, асабліва ў спякоту... Затое лёгкі халодны супчык — якраз тое, што трэба!**

### ШЧАЎЕ ХАЛОДНАЕ



*__Спатрэбіцца:__ вялікі пучок шчаўя, пучок зялёнай цыбулі, 4 яйкі, 7 — 8 бульбін, соль, смятана.*

Шчаўе прамыць, парэзаць і варыць некалькі хвілін. Бульбу памыць і зварыць у мундзірах. Яйкі зварыць, пачысціць і парэзаць кубікамі. Зялёную цыбулю дробна пакрышыць. Бульбу аблупіць. Зваранае шчаўе астудзіць, разліць па талерках, у кожную талерку дабавіць яйка і цыбулю, лыжку смятаны. Есці халаднік з бульбай упрыкуску.

### ХАЛАДНІК



*__Спатрэбіцца:__ 1 вялікі бурак, 3—4 яйкі, 1 ч. лыжка воцату, 1 свежы агурок, пучок цыбулі, пучок зяленіва, смятана, соль.*

Бурак пачысціць, памыць і адварыць. Затым дастаць з вады, астудзіць, надзерці на тарцы і ўсыпаць назад у ваду. Уліць туды воцат, пасаліць на смак. Яйкі адварыць, пачысціць і парэзаць кубікамі. Цыбулю і зяленіва дробна пакрышыць. Халаднік астудзіць, разліць па талерках, дабавіць яйкі, цыбулю, зяленіва і смятану. Падаваць на стол з хлебам.

**Марына ХАРЫТАНОВІЧ.**

# Шукаем пытанні, а не адказы

**Ніколі не трэба верыць тым, хто піша пра падарожжы напышліва і мудрагеліста. Які-небудзь аматар прыгожай славеснасці ў сваім эксцэнтрычным, на яго думку, опусе можа, безумоўна, напісаць і так: прыязджайце, маўляў, у Ветку — «і ўсе таямніцы гэтага горада, яго паданні і міфы адкрыюцца перад вамі, як жыватворны выток наталяе душу і чарэслы». Няма так, агульнапрынята, кандова і неінфарматыўна.**
**На самай справе прыгожая славеснасць — гэта адно, а валацужная рамантыка — нешта абсалютна іншае.**

## Рамантыкам



*По Ветцы трэба нагуляцца як след. Набадзяцца, навалацужыцца, круцячы галавою налева-направа. Крама на рагу Батракова і Кастрычніцкай мае назву «Вежа» і выглядае як маленькі кавалачак ці то замкавай сцяны, ці то проста нейкай казкі. Здаецца, зойдзеш у яе кім ёсць, а выйдзеш... Ну, напрыклад, гераіняй «Чырвонага Каптурка». І будзеш далей трымаць імідж — звернеш на Батракова не як на адну з асноўных тут вуліц, а як на лясную сцяжынку, што вядзе да бабулінай хаткі. А казка, між тым, працягнецца: ідучы паўз адзін толькі дом, трапіш на чарзе на вясновы бераг рэчкі, у летні кветкавы прылесак, на восеньскую сцежку, што вядзе да храма, і на зімовую дарогу, па якой імчыць, высякаючы з-пад капытаў зоркі-сняжынкі, белы-белы казачны конь.*

Ды і калі такое было, каб стары паважаны беларускі горад, ды яшчэ такі незвычайны, як Ветка, ні за што ні пра што свае таямніцы ўзяў ды першаму заезджаму адкрыў? А павадзіць кругом-навакал-побач? А загадкі нам новыя загадкі? І ці будзем мы паважаць такі «з душою расхрыстанай» горад, і ці атрымаем асалоду ад экскурсій па ім, калі будзем шукаць там адказы, а не пытанні?

## ■ Пра харчаванне

### НАВАТ ДОМА НЕ ТАК СМАЧНА

*Калі вы аматар кавы з малаком або вяршкамі, летнія падарожжы могуць здавацца вам маленькімі ахвяраваннямі: нават пастэрызаваныя малочныя прадукты ў цёплыя дні скісаюць, а згушчанка — варыянт, які падыходзіць тым, хто любіць, каб кава была салодкай. Але ёсць жа гурманы, якім падавай, як нам, каву з вяршкамі без цукру. Выйсце, дзякуй вытворцам, знойдзена: у крамах можна набыць сухія вяршкі, ды яшчэ з адмысловымі смакамі — арэхавым, шакаладным, ванільным, лікёравым...*

Вось прыедзеце вы ў Ветку, трапіце там, як шмат хто да вас, на Чырвоную плошчу, зойдзеце ў дом купца Грошыкава, у якім размешчаны знакаміты музей, уразіцеся яго экспанатамі — і што далей? Прачытаеце потым у купленым разам з сувенірамі буклецік, што Ветку заснавалі рускія старавеpы на землях мазырскага ваяводы Халецкага. І што вам з таго? Адкрыліся таямніцы? Ды наадварот. Дагэтуль вы спакойна не ведалі ніякага купца Грошыкава і не было вам ніякай справы да ваяводы Халецкага, а цяпер адзін клопат у галаве: што за Грошыкаў, які Халецкі? Ці той гэта Грошыкаў, што меў асабняк у Гомелі, на рагу Мільённай і Баярскай, пераназваных пасля адпаведна ў Білецкага і Баўмана? Ці бацька яго, ці, можа, дзядзька? Чым гандляваў і які меў прыбытак? А што той Халецкі з блізкага адсюль Хальча, аўтар «Кампендыума рытарычнага» і «Алегорый»? Кім ён гэтаму Халецкаму і тым старaверам, што з'явіліся ў пакоях апошняга з малітоўным прашэннем: прыгарнуць да сябе, будавацца дазволіць, бо, маўляў, на рускіх землях прыцясненні найноўшай абраднасцю? Можа, ён і ёсць?

Адны загадкі, спадарства. І чым больш, я вам скажу, капаць, тым глыбейшымі яны робіцца. І вось гэта якраз і ёсць тое, што я называю неабходным атрыбутам сапраўднага падарожжа або першай прыкметай валацужнай рамантыкі: нельга проста сузіраць дамы і прадметы, трэба праз іх упівацца вачыма ў мінулае.

Вось вы бачыце ў пакоі з каванымі вырабамі сярод безлічы цяжкіх, як падняць, музейных прадметаў чатырохлапы якар. Не проста так ён тут, а праз тое што ў Ветцы такія якары выраблялiся, і не толькі на свае патрэбы (наш купец Грошыкаў, між іншым, быў купцом па-спяховым, меў для прафесійных мэтаў ажно два параходы, дык якары яму, зразумела былі патрэбны), а нават для экспарту ў краіны, дзе гэтае майстэрства, відаць, не так працвітала (прынамсі вядома, што ў Грэцыю і Турцыю нашы «кошкі», як называюцца такія якары, дакладна выпраўляліся).

Я вам не да канца распавяла пра Грошыкава. Кажуць, што калі яго параход прычальваў да берага, тут жа аднекуль з'яўляўся старэнькі яўрэй. Ён сустракаў прыплыўшых музыкай — іграў на скрыпачцы. Калі, ведаючы гэта, выйсці ў Ветцы на бераг Сожа, можна, далібог, яе пачуць. А можа, і ўбачыць, як плыве па вадзе прымацаваная да абраза старавераў галінка, па іхняму ветка, над якой было з вялікім спадзяваннем прамоўлена: *«К коему берегу волнами прибьётся сия ветвь, там и быть нашему поселению, ибо это будет указанием Божьего перста»*.

Герб Веткі ледзь не самы просты, які толькі можна было прыдумаць: серабрыстая літара W на чырвоным «іспанскім шчыце». І вось вам, спадарства, загадка: ці можа гэтая W быць пачаткам слова «Ветка»? Правільны адказ: хутчэй не, чым так. Таму што, ну, як можа горад, заснаваны старавeрамі, рускімі перасяленцамі, пачынацца не на рускую В, а на польскую W? Нонсэнс! Нават калі вам пра гэта распавёў экскурсавод.

У чырвоным полі — дзве сярэбраныя кроквы (або козлы для распілоўкі дроў) накшталт літары W, а з самай сярэдзіны гэтай літары W вертыкальна выходзіць страла. Што гэта? Герб таго самага пана Халецкага, якога тут, у Ветцы, усе экскурсаводы, як згаварыўшыся, называюць выключна па прозвішчы і «мазырскім ваяводам». Гэта ад яго герба ўзялі веткаўчане сабе атрыбут.

Як жа ўсё-такі імя таго пана Халецкага?..

**Падарожнічала Святлана ДЗЯНІСАВА.**



Уваход у музей.

## Паслядоўнікам



*Самае знакамітае месца ў Ветцы — яе музей — звязана з іменем не толькі купца Грошыкава, але і народнага ўмельца Шклярава. Гэта ён адкрыў тут некалі такі вялікі музей, пачаўшы з рэчаў уласнай калекцыі. Калі, гуляючы па Ветцы, натрапіце на разны драўляны дом з птушкай, што вось-вось узляціць з канька, вясёлымі рамонкамі на франтоне, карункавым балконам і варотамі, што нагадваюць царкоўныя, то ведайце: гэта дом Шклярава Фёдара Рыгоравіча, мясцовага чалавека-легенды, жыццё якога перайшло мяжу вечнасці ў 1988-м.*

## ■ Што бывае

### ІДЭІ



*Пры наведванні музеяў нестандартныя ідэі непазбежна ўзнікаюць — праз вострае жаданне захапіць з сабою не толькі настрой і ўражанні, але і нешта матэрыяльнае. Вось што мне асабліва спадабалася ў Веткаўскім музеі: разныя драўляныя вароты — раз, шафа з чырвонага дрэва з карункавым аздабленнем — два, медны цыліндрычны самавар на высокіх гнутых «лапках» — тры, вялізныя шалі на ланцугах (быццам арэлі) — чатыры, бюрка на стромкіх ножках — пяць. І асабліва — лічыльная косткі з фігурным краем, зробленая з акна фатаграфічная рамка, фаліянты-старадрукі, ручнік з качкамі і распісны блакітны чайнічак. Вось гэта ўсё без адзінага выключэння, як я ўжо недзе пісала, выкананае ў мініяцюры з дрэва ці пластыку, гліны, паперы, саломы, металу, паркалю, яечнай шкарлупіны, яшчэ чаго-небудзь, я хацела б набыць у сувенірнай лаўцы на памяць аб падарожжы. І гэтая ідэя здаецца мне слаўнай, вартай увасаблення.*

## ДАЛЁКА І БЛІЗКА

**Трэці Сырны фэст пройдзе 20 чэрвеня ў азёрным комплексе Батанічнага сада ў Мінску з апоўдня да сямі вечара. Гандаль і дэгустацыі, праверка на «сырную сумяшчальнасць», сырныя алімпійскія гульні, сырнае казіно, свята рознай смакаты, мышыны забег і бойка з крысіным каралём. Відаць, будзе смачна.**

Некалі, 111 гадоў таму, дзень 16 чэрвеня праславіўся тым, што стаў Днём Блума (Bloomsday, успамінайце раман Джэймса Джойса «Уліс»). У гэты дзень адбылося першае спатканне Джойса і Норы Барнакль, пакаёўкі з Finn's Hotel, на Nassau Street. З таго дня напісанае зрабілася ўспамінам. Або наадварот. І вось кожны год 16 чэрвеня прыхільнікі рамана «Уліс» па ўсім свеце адзначаюць Bloomsday: едуць у Ірландыю, ідуць па маршруце герояў, ад вежы Мартэла да паба Дэві Бірн. Не жадаеце далучыцца?



**20-27 чэрвеня ў Магілёве — духоўна-асветніцкая выстава-кірмаш «Беларусь Праваслаўная». Прадметы царкоўнага ўжытку для дома і храма, літаратура, абразы, святыні Іерусаліма, мёд, зёлкі. Спецыяльная праграма «Задай пытанне святару», майстар-класы па званарстве, канцэрты, семінары, прэзентацыі выданняў, фотавыставы. Кірмаш размесціцца каля прыпынку «Дыягнастычны цэнтр», а мерапрыемствы зоймуць галоўную гарадскую бібліятэку і «Плошчу зорак».**

Міжнародны фэст крапівы праходзіць штогод. Дзе б вы думалі? У сяле Крапівіна, ёсць такое пад Тулай. Абставіны месца гавораць самі за сябе: арганізатар свята — музей-запаведнік «Ясная Паляна» і міжнародны фонд «Спадчына Л.М. Талстога». Раней Крапівіна было горадам. На гербе яго красаваліся галінкі крапівы. Цяпер у Крапівіне з уздзелам турыстаў праходзіць ачмурэнна цікавае дзейства, якое чаго толькі ў сябе не ўключае. Сёлета пачатак свята прыпадае на 20 чэрвеня. Калі ў гэты дзень, дабраўшыся да Крапівіна, апячыся там як след крапівою, то ніякія хваробы не адолеюць цэлы год.



**Абрэвіятура ММКФ у расшыфроўцы даўно патрэбы не мае. Або расшыфроўваецца так: адзін з найстарэйшых кінафорумаў свету. Прынамсі, другі (!) пасля Венецыянскага. Некалі, у 1935-м, яго адкрываў Эйзенштэйн фільмам «Чапаеў». Хоць гісторыкі кіно вам скажуць, што ММКФ нарадзіўся ў 1959 годзе. І дададуць: штогадовым і значным ён стаў у 1999-м. Ну, і няхай сабе. Галоўнае — ён цікавы. Таму аматары кіно і сёлета не прапусцяць дзесяць сінема-дзён у канцы чэрвеня.**

На тамтэйшым кірмашы — як на Сарочынскім: адчуваеш сябе ўдзельнікам ці сведкам нечага звышнатуральнага. «Чалавек харошы, дай дзеду грошай», — просіць мужычок у вышыванцы і паласатых штоніках, падперазаных вяроўчынай. Мужычок любіць, калі да яго падыходзяць, ляпаюць па плячы, фатаграфуюцца з ім. Але сам — і з месца не кранецца. Вочы ў яго хітраватаслівыя, твар — саламяны. І колькі яшчэ такіх самых дзівакоў сустрэнуцца на Купаллі ў Александрыі? Можна іх і не лічыць, але наведаць кожнага — варта. Два дні ў пачатку ліпеня, 4-га і 5-га.



Сямейная газета 11 чэрвеня 2015 г.

**Некалькі гадоў таму ў Слаўгарадскім раёне пачалі адраджаць традыцыі сыраварэння. І аднымі з першых за справу ўзяліся Леанід і Тамара Цвярдоўскія з вёскі Рудня. Мястэчка, між іншым, з багатай гісторыяй. (Менавіта на тутэйшай рэчцы Пясчанцы больш за тысячу гадоў таму ваявода Воўчы Хвост разбіў радзімічаў і прымусіў іх плаціць даніну князю Чырвонае Сонейка.) Да Чарнобыля гэта была вялікая вёска, нават мелася школа. Зараз засталіся клуб, крама і бібліятэка. Але мясціны тут насамрэч казачныя, а людзі гасцінныя.**

**Каля дома Цвярдоўскіх на вуліцы з рамантычнай назвай Азёрная растуць кветкі і пахне ... малаком. У гаспадарцы Леаніда і Тамары ажно тры каровы. Яны сапраўды карміцелькі, бо не толькі забяспечваюць сваіх гаспадароў малочнай прадукцыяй, але яшчэ і даюць ім магчымасць зарабіць. Попыт на Тамарыны сыры настолькі вялікі, што жанчына ледзь паспявае выконваць заказы. За час нашай размовы ёй патэлефанавалі двойчы. Прычым адна жанчына з Масквы. Яна прыехала на сваё лецішча ў Слаўгарад і найперш успомніла пра сыр.**

**ПРЭМ'ЕРА РУБРЫКІ**

*Спрадвеку нашы продкі жылі сваёй справай: плялі лапці, нарыхтоўвалі мёд, ткалі, кавалі... Зараз гэтыя традыцыі, бадай, забыліся, але сустракаюцца людзі, для якіх рамяство не проста хобі, а сэнс жыцця і галоўная крыніца даходаў. Менавіта яны будуць гасцямі нашай рубрыкі, раскажуць, з чаго пачыналі, чым ахвяравалі, ці спраўдзіліся іх надзеі. Іх досвед будзе добрым прыкладам для ахвотных набрацца карысных ведаў і дасягнуць найвышэйшых ступеняў майстэрства.*

# СОНЕЙКА НА ДАЛОНІ



**Леанід, Святлана і Тамара ЦВЯРДОЎСКІЯ — гэта яшчэ не ўся сям'я.**

## 8 літраў малака, або 1,5 кілаграма сыру

З Тамарай мы пазнаёміліся на сырным фэсце, які праходзіў у Слаўгарадзе ў красавіку. Яна адна з 15 слаўгарадскіх сыравараў, што аб'ядналіся ў ініцыятыўную групу і падтрымліваюць адзін аднаго. Некалькі гадоў таму гэтай справай ёй прапанавала заняцца яе добрая знаёмая Таццяна Гурына — на той час дырэктар мясцовага фонду развіцця сельскіх тэрыторый «Адраджэнне-Агра». Праз гэты фонд людзей заахвочвалі матэрыяльнай дапамогай на развіццё справы і нават вазілі ў Францыю па перайманне вопыту. Тамара за мяжой пабываць не паспела, але ў Мінск на майстар-клас ездзіла. Толькі ў яе самой столькі вопыту, што можа каго хочаш карыснай справе навучыць. Яна добра памятае, як гэта рабіла яе маці. Ды і сама потым неаднаразова гатавала сырныя прысмакі для сям'і. Цяпер гэтую смакату змаглі ацаніць і іншыя. Нават дэпутат Палаты Прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Таццяна Кананчук, якая часта наведвае Слаўгарад па сваіх дэпутацкіх справах, перавагу аддае менавіта Тамарыным сырам. У яе ён трох сартоў — з соллю, салодкі з разынкамі і плаўлены. З плаўленым больш за ўсё клопатаў, бо трэба спачатку зрабіць кефір, потым тварог, ды праварыць яго ў малацэ, каб не быў кіслым. Дабавіць яйка, масла і крышачку соды. Надаць яму форму...

Тамара кліча мяне ў святая святых — на кухню, дзе нараджаецца той сыр. На пліце булькае, кіпіць, дыхае ў вялікай каструлі тварожная маса.

— Найперш ставім на газоўку каструлю свежага хатняга малака, — інструктуе гаспадыня на той выпадак, калі гэта натхніць мяне паўтарыць яе подзвіг. Сама яна на зайздрасць спрытна абыходзіцца з важкай ёмістасцю. — Даводзім да кіпення. Дабаўляем соль, воцат і глядзім, як малако ператвараецца ў тваражок. Трэба, каб ён быў больш цвёрдай кансістэнцыі.

Майстрыха варожыць над тварожнай масай, увесь час памешваючы яе. Барані Бог, прыгарыць — прападзе столькі дабра. Па ходзе гаспадыня дзеліцца маленькімі хітрыкамі, без якіх у справе не абысціся. Трэба ведаць, што каструлю лепей браць алюмініевую, малако тады не будзе так прыгараць. У Тамары яна яшчэ савецкага перыяду — васьмілітровая! Дарэчы, з 8 літраў малака сыру атрымліваецца 1,3-1,4 кілаграма.

— Бачыце, сыроватка ўжо адыходзіць, хутка трэба будзе здымаць каструлю з пліты, — папярэджвае яна. І я таксама пачынаю адчуваць нейкую адказнасць за сам працэс.

## «Рэцэпт мне перадала маці»

Прыадкрывае сямейны сакрэт мая суразмоўца і дадае: «Раней людзі трымалі кароў і малака дзяржаве не здавалі. Гэта цяпер у крамах усё ёсць. А раней чым было дзяцей карміць? У нашай сям'і, напрыклад, выхоўвалася пяцёра».

Рудня — родная для Тамары вёска, яна тут нарадзілася і дзяцінства прайшло на гэтай жа Азёрнай вуліцы. А новы вялікі дом Цвярдоўскіх стаіць якраз на месцы былога, маленькага, дзе жыў дзядуля Тамары. Муж Леанід таксама тутэйшы, з суседняй вёскі Міхайлоў — да яе адсюль рукой падаць, дастаткова прайсці цераз поле. Разам наведвалі пачатковую школу ў Рудні, а калі падраслі, закахаліся адно ў аднаго. Хлопец вярнуўся з арміі — пажаніліся. Бацькі нявесты маладым адразу ж карову падаравалі. Быццам бы наперад зналі, што менавіта з гэтай жывёлай будзе звязана іх сямейная справа. Потым як у вядомай прыказцы: нарадзілі сына, пабудавалі дом, пасадзілі дрэвы.

— Муж у мяне — вялікі майстар, не паверыце, але ён гэты дом пабудаваў адзін, без памочнікаў, — удакладняе Тамара. — Жылі мы тады ў маіх бацькоў, харчаваліся за іх кошт, а заробак мужа цалкам ішоў на будоўлю. Атрымаў грошы — прывёз цэглу. З наступнага заробку купіў блокі, потым — цэмент. Два гады запар на рабоце не браў адпачынак, а потым узяў адразу два і пачаў будоўлю. Калі засяліліся, з мэблі былі толькі двухспальны ложак і стол, плюс два эмаліраваныя вядры, каб было ў чым прынесці з калодзежа ваду. Нават без крэслаў абыходзіліся. З часам, вядома, усё з'явілася. Але галоўнае наша багацце — дзеці. Іх у нас трое: Аляксандр, Дзмітрый і Святлана.

На маё наіўнае «а чым бацькі дапамагалі?» сужэнцы толькі ўсміхаюцца.

— Ды чым яны нам маглі дапамагчы? — здзіўляецца Леанід. — Гэта цяпер моладзь без бацькоўскай падтрымкі пражыць не можа, а раней усё было па-іншаму. Людзі ў калгасе працавалі і грошай за гэта не атрымлівалі. Калі сын жаніўся, ён павінен быў сам сабе дарогу прабіваць.

Гаспадарчая жылка ў Цвярдоўскіх вельмі моцная. Гэта цяпер у іх тры каровы і куры. А быў перыяд, калі яшчэ і свіней трымалі. Колькасць парасят да 30 даходзіла.

— Цяпер наогул нявыгадна трымаць свіней, — разважае гаспадар. — За парася два мільёны аддай, а ці выжыве яно яшчэ? І нават калі ўсё будзе добра, «навару» ніякага. Калі падлічыць, колькі яно з'ядае за сваё жыццё, атрымліваецца даражэй, чым купляць мяса на базары. Мы гэта дакладна ведаем і ніколі не абураемся, што выразка «занадта дарагая». Хацелася б, зразумела, таннейшага мяса, але дзе яго ўзяць? Людзі і сыр хацелі б купіць па больш нізкай цане, але вы спачатку палічыце, колькі ўсяго ўкладзена ў працу! Карову пакармі, прыбяры за ёй, падаі, потым сыр зрабі. У нас ён каштуе 90 тысяч за кілаграм, салодкі — 100 тысяч. Ці ж гэта дорага?

## Праверана: можна есці

**«Навошта купляць таматны сок, калі яго можна зрабіць сваімі рукамі?» — лічаць Цвярдоўскія і прапануюць браць прыклад з іх. Усё вельмі проста. Выціскаем памідоры на сокавыціскалцы, даводзім да кіпення, дабаўляем соль па смак — і пад металічную накрыўку. Смачней за ўсё ўжываць таматны сок са смятанай, на смак чымсьці нагадвае салату са свежых памідораў. Цвярдоўскія адразу закрываюць па 30 (!) трохлітровых слоікаў. І нічога да наступнага года не застаецца. А яшчэ тут нарыхтоўваюць у вялікіх аб'ёмах бярозавы сок. Як у чыстым выглядзе, так і ў купажы. Напрыклад, бярозава-яблычны робіцца ў прапорцыі: 8 літраў бярозавіку на 3 літры яблычнага соку. І вельмі незвычайны атрымліваецца смак у бярозавіка, калі на тры літры соку дабавіць тры цукеркі — барбарыскі. Паспрабуйце — абавязкова спадабаецца.**

## «Першыя агуркі ядзім у красавіку»

Акрамя сыру, Цвярдоўскія займаюцца вырошчваннем садавіны і гародніны. Першае, што кінулася ў вочы, калі зайшла ў дом — цэлая абойма трохлітровых слоікаў з бярозавікам. «Вы яшчэ наш падвал не бачылі, — смяецца гаспадыня. — Там у нас закаткі на любы густ. Першыя агуркі спрабуем яшчэ ў канцы красавіка, а ў пачатку чэрвеня на стале ўжо памідоры. Бульба і зерневыя таксама выключна свае. Пад гэтыя культуры ў нас адведзена паўтара гектара зямлі. Сям'я вялікая, ды і жывёлу трэба чымсьці карміць».

Тамара хацела б пашырыць гаспадарку і ўзяць яшчэ дзве каровы, але муж пакуль не гатовы. На ім і так цалкам ляжаць клопаты па доглядзе жывёлы. «Гэта мой верны памочнік, усю цяжкую працу сам робіць», — з павагай і пяшчотай глядзіць на сужэнца Тамара Іванаўна. Леанід Мікалаевіч сціпла маўчыць.

— А з нарыхтоўкай кармоў праблем няма? — спрабую разгаварыць яго.

— Пакуль што не было, — адказвае ён. — Старшыня калгаса «Прысожжа» выдзяляе поле для касьбы.

Замест каня ў гаспадарцы — трактар. Галава сямейства яго амаль што ўвесь сваімі рукамі сабраў. І да трактара шмат чаго зрабіў: касілку, культыватар, сажалку. «У яго рукі залатыя і галава на месцы, — не перастае нахвальваць жонка. — Доўгі час працаваў на розных там МАЗах-КамАЗах. У савецкі час за добрую працу прэміі атрымліваў, розныя падзякі. У сацспаборніцтвах заўсёды быў першы. А зараз вось цалкам сябе гаспадарцы прысвяціў».

На пытанне, ці выгадна займацца сямейным бізнесам, муж з жонкай адказваюць: было б нявыгадна, не займаліся б. Трымаць карову ў вёсцы вельмі прыбыткова. За суткі яна дае прыблізна 15 літраў малака — гэта прыкладна 1,8 кілаграма сыру, на якім можна зарабіць каля 200 тысяч рублёў. Калі кармы для каровы нарыхтоўваць самім, як гэта робяць Цвярдоўскія, прыбытак забяспечаны.

— А вось пра адпачынак даводзіцца забыць, — усміхаецца Леанід. — У 4 раніцы або позна вечарам збегаў на возера, злавіў некалькі рыбін і хуценька дадому. Вось табе і ўвесь адпачынак. Але мы ўжо без працы не можам — сумна.

— Навошта нам той адпачынак, калі і так не дрэнна, — смяецца Тамара. — З сырамі ездзім і ў Мінск, і ў Александрыю, і ў Дрыбін. Пасля ўдзелу ў розных фестывалях вяртаюся, як з адпачынку. У мяне тады такі прыліў энергіі, словамі не перадаць.

Агульная справа і сям'ю робіць больш моцнай. Старэйшы сын пабудаваў кватэру ў Слаўгарадзе, але яго дзеці ў бабулі з дзядулем частыя госці. Асабліва старэйшая ўнучка, якой ужо споўнілася 10 гадоў. Любіць па ягады ў лес хадзіць і ўжо прыглядаецца да таго, як бабуля сыр «варыць». А Дзмітрый і Святлана наогул жывуць з бацькамі. Нядаўна бацька з сынам лазню зручную пабудавалі, нават з дому не трэба выходзіць. Святлана таксама першая памочніца па хатніх справах.

— А яшчэ па гаспадарцы дапамагаюць сястра з пляменніцай, іншыя родныя і нават знаёмыя, — пачынае пералічваць Тамара ўсіх, хто мае дачыненне да агульнай справы, і збіваецца на другім дзясятку. «Усе яны наша сям'я», — смяецца яна, не жадаючы дзяліць блізкіх ёй людзей на сваіх і чужых. І зноў запрашае на кухню. Адказны момант надышоў. Тое, што нядаўна яшчэ булькала на пліце, гатова ператварыцца ў сыр. Жанчына дастае з палічкі формы, засыпае туды яшчэ рыхлы тварог і ставіць наверх 17-кілаграмовую гіру. Дастаткова 5 гадзін, каб сыр паспеў. Да кандыцыі ён дойдзе ўжо ў халадзільніку. Як толькі прадукт зацвярдзее, яго можна смела несці на рынак. І можаце не сумнявацца, пакупнікі абавязкова знойдуцца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.**
















## Майстар-клас ад Тамары

1. Малако даводзім да кіпення, дабаўляем соль, воцат і атрымліваем тваражок.
2. Сыроватка ўжо адходзіць, хутка трэба будзе здымаць каструлю з пліты.
3. Тварожную масу працэджваем праз друшляк.
4. Кветкавыя вазоны як нельга лепей падыходзяць у якасці формы.
5. Накрываем тварог талерачкай.

# Извещение о проведении 15 июля 2015 г. торгов по продаже конфискованного имущества

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества)** | **Незавершенное незаконсервированное капитальное строение (жилой дом с постройками), расположенное на земельном участке №625082302601000016 по адресу: Минская область, Солигорский район, Краснодворецкий сельский совет, аг. Краснодворцы, пер. Садовый-1, д. 8 (площадь земельного участка 0,2492 га)** |
| **Начальная цена** | 411 900 000 рублей |
| **Сумма задатка** | 41 190 000 рублей |
| **Организатор аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 |

Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

*Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Для участия в аукционе по нескольким предметам торгов необходимо внести задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.*

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится **15 июля 2015 г. в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 15.06.2015 по 10.07.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ООО «Стройснабкомплект» (продавец) ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ**

## лечебно-профилактического корпуса

**общей площадью 2549,5 кв.м (инв. № 600/С-41842), расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623685200001000513, площадью 1,4240 га по адресу: Минская область, Минский район, Острошицко-Городокский с/с, район аг. Острошицкий Городок.**

На зем. участке имеются ограничения прав в использовании: зона массового отдыха населения и туризма (зона отдыха «Острошицкий Городок», санаторий-профилакторий «Мир»), охранная зона водных объектов, используемых для питьевого водоснабжения (водозабор «Боровляны»).

**Начальная цена с НДС – 5 900 000 000 бел. руб.**

**Задаток 10% от начальной цены (590 000 000 бел. руб.) перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (десяти) банковских дней со дня проведения, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

*Предыдущее объявление было опубликовано в газете «Звязда» от 24.02.2015.*

Аукцион состоится **22.06.2015 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.06.2015** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**

---

Утерянный страховой полис «Обязательное страхование гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь» серии ВС № 7617095 в количестве 1 штуки в представительстве Белгосстраха по Слуцкому району **считать недействительным.**

УНП 600013344

---

**КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» информирует,**

**что в аукционных торгах по продаже земельных участков в Жабинковском районе Брестской области в частную собственность граждан Республики Беларусь, назначенных на 18 июня 2015 года, по лоту №8 считать верным адрес земельного участка: Жабинковский с/с, д. Залузье, ул. Садовая, 8.**

**Полная информация об аукционных торгах по тел. (0162) 53-81-92, 53-45-65. Сайт: bgcn.by**

УНП 290433924

---

# ООО «БелИнвестОценка» извещает о проведении открытого аукциона по продаже здания магазина № 3, находящегося в собственности ОАО «ДОРОРС»

**Лот № 1. Здание магазина №3, расположенное по адресу: г. Орша, ул. Молокова, 17 (регистрационный номер 240/С-31314, далее – объект).**

Характеристика объекта: двухэтажное здание, стены кирпичные, перегородки кирпичные, перекрытия железобетонные, крыша совмещенная, полы – плитка, линолеум, бетон, имеется центральное отопление, стальной водопровод, канализация (чугунные трубы), электроосвещение, телефон. Общая площадь 589,5 кв.м. Объект продается без условий. **Объект передан в аренду до 30.06.2017.**

Площадь земельного участка 0,0427 га, кадастровый номер 242400000001007378, предоставлена в постоянное пользование, целевое назначение – для обслуживания здания магазина № 3; ограничения – охранная зона магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений – 0,0180 га.

Начальная цена продажи **3 123 480 000 (Три миллиарда сто двадцать три миллиона четыреста восемьдесят тысяч)** рублей (с учетом НДС).

Сумма задатка **312 348 000 (Триста двенадцать миллионов триста сорок восемь тысяч)** рублей.

**Аукцион состоится 14 июля 2015 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 4, оф. 411.**

**Продавец объекта – ОАО «ДОРОРС».**

**Организатор аукциона – ООО «БелИнвестОценка».**

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), представившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, а также следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованную в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

*Задаток перечисляется Организатору аукциона на р/с №3012150544012 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369. Получатель – ООО «БелИнвестОценка», УНП 191692351.*

Аукцион проводится в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже объектов недвижимости и иного имущества, утвержденным Организатором торгов.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Аукцион проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести объект. Данный участник объявляется победителем аукциона, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе аукциона участники могут предлагать свою цену за продаваемый объект в соответствии с порядком проведения аукциона.

**Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по 10.07.2015 включительно по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 4, оф. 411 (здание ГО «Белресурсы»). Заключительная регистрация участников 14.07.2015 с 09.00 до 09.45 по месту проведения аукциона.**

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней после проведения аукциона; заключить договор купли-продажи с ОАО «ДОРОРС» не позднее 5 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи в рабочее время магазина с 10.00 до 18.00. Контактный телефон ОАО «ДОРОРС» 8(017) 240-61-87. Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (017) 398-28-50, 398-29-44, 8(029) 142 33 07; e-mail: belinvo@tut.by, на сайте belinvo.by

---

**КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» 23 июня 2015 года проводит аукционные торги по продаже объектов недвижимости Брестской областной организации Белорусского профессионального союза работников культуры:**

**ЛОТ №3:**

- капитальное строение с инв. №101/С-8494 **(здание спального корпуса №1)** площадью 104,5 м², с объектами принадлежности (пристройка);
- капитальное строение с инв. №101/С-8493 **(здание спального корпуса №2)** площадью 65,4 м², с объектами принадлежности (пристройка),
- капитальное строение с инв. №101/С-9927 **(погреб бетонный)** площадью 43,7 м²;
- капитальное строение с инв. №101/С-9928 **(склад одноэтажный блочно-кирпичный)** площадью 104 м², расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский с/с, урочище Сосновый бор, участок №3;
- капитальное строение с инв. №101/С-8492 **(здание спального корпуса №3)** площадью 116 м², расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский с/с, 8, пионерский лагерь «Зорька»;
- капитальное строение с инв. №101/С-9929 **(склад)** площадью 44,2 м², расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский с/с, 11/5, урочище Сосновый бор; на земельном участке, расположенном по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский с/с, урочище Сосновый бор, участок №3 с кадастровым номером 122581500002000032, площадью 0,8376 га.

**Начальная цена продажи: 1 710 000 000 рублей.**

**Полная информация об аукционных торгах по тел. (0162) 53-81-92, 53-45-65. Сайт: www.bgcn.by**

УНП 290433924

---

# ОАО «СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 8» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Номер лота | Предмет торгов | Начальная цена, долл. США без НДС* | Размер задатка, долл. США* |
|---|---|---|---|
| **Лот №1** | Объект недвижимости: Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-71819, площадью 1139 м² (назначение: Административное помещение, наименование: I-II этаж административно-бытового корпуса), находящееся в объекте недвижимости (капитальном строении с инвентарным номером 100/с-594), расположенном на земельном участке с кадастровым номером 140100000001008618, площадью 0,1118 га) | 547 516 | 54 752 |
| **Местонахождение объекта** | г. Брест, ул. Героев обороны Брестской крепости, 17-1 | | |
| **Характеристики замельного участка** | Земельный участок выделен продавцу на праве постоянного пользования (1251/2500 долей) для обслуживания административного помещения | | |
| **Условия продажи** | без условий | | |
| **Продавец (Балансодержатель)** | ОАО «Строительный трест №8» | | |
| **Организатор торгов** | ОАО «Строительный трест №8» | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 10-ти рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| **Шаг аукциона** | 5% от начальной цены лота | | |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи | | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012121884509 в Региональной Дирекции № 100 ОАО «БПС-Сбербанк», код 153001369, получатель платежа – ОАО «Строительный трест № 8» | | |
| **Аукцион состоится 22 июня 2015 г. в 11.00 по адресу: 224013, г. Брест, б-р Шевченко, 4, зал заседаний ОАО «Строительный трест № 8», каб. 230, 231** | | | |

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ОАО «Строительный трест № 8».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

* Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на день оплаты.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: 224013, г. Брест, б-р Шевченко, 4, каб. 418 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

**Последний день приема заявлений – 19 июня 2015 г. до 12.00.**

**Контактный телефон организатора аукционных торгов: 8-(0162)-22-01-72.**

---

**РУП «Белпочта» объявляет**

## О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ

**по выбору подрядной строительной организации для выполнения ремонтно-строительных работ на объекте «Текущий ремонт помещений в зданиях и сооружениях базы отдыха «Дружба».**

**Процедура переговоров состоится «16» июня 2015 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.**

Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства РУП «Белпочта» – тел.: 293-55-29, 293-55-28.

УНП 101015738

---

23 июня 2015 г. в 16.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Чернавчицкий завод ЖБИ».

Повестка дня:

1. О перевыборах членов наблюдательного совета общества.
2. О вознаграждении членов наблюдательного совета.

Местонахождение ОАО «Чернавчицкий завод ЖБИ»: Брестский р-он, д. Чернавчицы, ул. Трудовая, 1Г.

Место проведения собрания: Брестский р-он, д. Чернавчицы, ул. Трудовая, 1Г.

Время регистрации в день проведения собрания с 16.00 до 16.30.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 17.06.2015 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНП 200034706

■ Фотаздымак з гісторыяй

# ЖЫВІ І ПОМНІ...

**Перада мной — любімы фотаздымак з сямейнага альбома, дзе наш бацька — малады салдат Вялікай Айчыннай ля разгорнутага сцяга воінскай часці. І адразу ўспамінаецца ўсё, што ён расказваў пра гэтыя падзеі, пра сваё жыццё...**





Нарадзіўся наш тата Флёрка Павел Рыгоравіч 2 мая 1922 года ў в. Ветвіца Лельчыцкага раёна. Яго бацька, як і многія іншыя, быў рэпрэсіраваны. Таму дзяцінства выдалася цяжкае. Акрамя яго, засталося яшчэ трое дзяцей.

Калі пачалася вайна, бацьку было 19 гадоў. У Чырвоную Армію быў прызваны 12 ліпеня 1941 года. Разам з ім з раёна было чалавек 30 (а вярнуліся толькі 2 ці 3).

Іх перакінулі, як успамінаў тата, пад горад Ялец Арлоўскай вобласці, дзе была сфарміравана 5-я Чыгуначная брыгада. Ён любіў паўтараць, што застаўся жывы дзякуючы свайму бацьку. І растлумачваў гэта так: «Спачатку назвалі прозвішчы прызыўнікоў і адразу адправілі іх на фронт. Усе яны ў першым баі загінулі. А тых, каго не назвалі, залічылі ў чыгуначную брыгаду і пакінулі ў тыле. Гэта былі дзеці «ворагаў народа», у каго бацькі былі рэпрэсіраваны. Ім не давяралі. І сапраўды знайшліся такія, што захацелі ўцячы, дэзерціраваць. Звалі з сабою і бацьку, але ён наадрэз адмовіўся. Бацька служыў плотнікам-маставіком у 10-м асобным батальёне (бралі ў яго толькі тых, хто добра валодаў сякерай), дзе было каля 1000 салдат, да сакавіка 1942 года. Яны будавалі чыгуначныя масты — пад бомбамі варожай авіяцыі і днём, і ноччу.

Гэта быў «нябачны фронт»...

Пасля 1 мая 1945 года бацька служыў на Далёкім Усходзе. Іх рыхтавалі да баёў з Японіяй. А потым працаваў на аднаўленні чыгункі Паўночнага Урала. Менавіта да гэтага часу і адносіцца фотаздымак каля разгорнутага сцяга часці №58. Гэта была, як казаў бацька, вялікая ўзнагарода.

Трымаю ў руках ваенны білет бацькі № 0642357. На старонцы 9 запісаны дзяржаўныя ўзнагароды: медаль «За адвагу», медаль «За вызваленне Варшавы», медаль «За ўзяцце Берліна», медаль «За перамогу над Германіяй». Менавіта гэтыя медалі красуюцца на грудзях у бацькі на фотаздымку.

У сакавіку 1948 года бацька быў дэмабілізаваны. Вярнуўся на сваю радзіму. У тым жа 1948-м у вёсцы Крупка сустрэў свой лёс — дзяўчыну Ніну Кліменку. Яна была таксама сіратой. Разжываліся цяжка. Пабудавалі спачатку невялікі дом, а пасля — новы, вялікі, прыгожы, які і цяпер стаіць у вёсцы Крупка. Тут і пражылі яны ўсё сваё жыццё. Тут нарадзілася пяцёра дзяцей: два сыны і тры дачкі. Наш бацька — майстар на ўсе рукі. Сам рабіў сталярку, печы, грубы, цэбары, бочкі, канапы, шафы. Усё ў нашым бацькоўскім доме зроблена яго залатымі рукамі. Нават рабіў нам лыжы, санкі, канькі. Ніколі мы, дзеці, не чулі ад яго брыдкага слова, не бачылі п'яным. Ён мог выпіць толькі ў свята ці на вяселлі. Бацька працаваў аб'ездчыкам, загадчыкам зернясклада, трыццаць гадоў быў брыгадзірам паляводчай брыгады №4 саўгаса «Буйнавічы».

Да пары яму і наша любімая матуля Ніна Арцёмаўна. Стаўшы маці-гераіняй, яна ўсе свае сілы аддала нам, дзецям. Мама вучыла нас маляваць, спяваць, вышываць, вязаць, ткаць на кроснах, прасці кудзелю. Ад маці мы з дзіцячых гадоў засвоілі, што нельга хлусіць, смяяцца са старых, з калек, што трэба паважаць настаўнікаў, старэйшых. Нельга ленавацца, трэба шчыра працаваць...

Вось з такім мацярынскім і бацькоўскім багажом і пайшлі мы, пяцёра, у жыццё. Сёння ў нас на ўсіх восем дзяцей і трое ўнукаў.

На зямлі мае бацькі свой абавязак выканалі. Бацька перажыў маці на 2 гады і пайшоў з жыцця на 93-м годзе. Ён упаў ад інсульту на калгасным полі, якое абхадзіў сотні разоў сваімі нагамі. Мы ж, дзеці, заўсёды будзем адчуваць сябе ў неаплатным даўгу перад імі...

**Наталля ФІЦНЕР,**
*в. Буйнавічы Лельчынскі раёна.*

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі з гісторыяй (не больш за тры) дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а, або info@zvyazda.minsk.by. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе адзначаны прызам. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца аўтарам.***

■ Мама, пачытай!

## РЫБАЛОЎ

...Ай-я-яй, няма ўпынку!
Як сапраўдны вадалаз,
Коцік Філя ловіць рыбку,
Запусціўшы лапку ў таз.

Мокры нос у рыбалова.
Годзе, коця, быць бядзе!
Ён жа адпачне й нанова
Лапкай боўтае ў вадзе.

## ВУЧОНАЯ КОШКА

Мама фарбы не купіла,
Хоць дачушка і прасіла,
А купіла кніжку
Пра ката і мышку.

Мурка хітра паглядзела
І да кніжкі той падсела,
Цягне лапкай акуляры —
Пачытае для Варвары?

**Галіна НІЧЫПАРОВІЧ,**
*в. Магільна, Уздзенскі раён.*

■ Пясочніца

## КРАМЫ БЫВАЮЦЬ РОЗНЫЯ

— Мам, — угаворвае пяцігадовая Ксюша, — а хадзем у краму?

— Ты ж не любіш са мной па крамах хадзіць, — здзіўляецца маці.

— А мы пойдзем у правільную, туды, дзе можна будзе дзіцяці што-небудзь добрае купіць, — тлумачыць дзяўчо.

## САПРАЎДНАЕ ЧАРАЎНІЦТВА

— Я чараўнік! — радасна абвяшчае родным маленькі Юрась.

— Адкуль ты ведаеш?

— Бо я вось як умею: увечары толькі накрыюся коўдрай, а як раскрыюся — адразу наступае раніца!

## АД ПАМЕРУ НЕ ЗАЛЕЖЫЦЬ

Далёкая сваячка прыязджае ў госці і ўпершыню бачыць Насцю, якой 2,5 года.

— Вой, якая маленькая! — замілоўваецца цётка.

— Затое якая разумная! — сур'ёзна адказвае дзяўчынка.

## АПЕТЫТ ПРЫХОДЗІЦЬ ПАДЧАС...

— Якая ты малайчынка, — хваліць Соню бабуля, — усё з'ела!

— Так, — сумна пагаджаецца малая, — усё. — І ўжо ледзь не са слязьмі ў голасе дадае: — Зусім нічога не засталося... нават цукеркі!

## ПРА ШКОДУ І КАРЫСЦЬ

— Мам, — цікавіцца 6-гадовы Максім, — а смятана карысная?

— Так, карысная.

— А зеляніна?

— І зеляніна вельмі карысная.

— Тады купі мне, калі ласка, чыпсы «смятана з зелянінай»!

## ВУСНАМІ МАЛЕЧЫ

4-гадовая Волечка корпаецца ў сумачцы, потым з хітрынкай у вачах пытаецца:

— Бацькі, адгадайце, што ў мяне ў сумцы?

— Што? — зацікаўлена перапытвае тата.

— Вэрхал! — радасна адказвае дзіця.



# ЦЯГНІК ЗАБАЎ (для малечы)

### Расфарбуй малюнак



### 3D–малюнак



### Знайдзіце 8 адрозненняў



### Народная забаўлянка

**Пайшоў каток у лясок,**
**прынёс каток паясок.**
**Пайшоў каток на ганачак,**
**прынёс нам абаранчак.**
**Пайшоў каток на рыначак,**
**прынёс каток разыначак.**
**Пайшоў каток на таржок,**
**прынёс каток піражок.**
**Пайшоў каток на вулку,**
**прынёс нам хлеба булку.**



**Вядучая рубрыкі Алена БІЗУНКОВА.**

*Людзі кажуць:* ***«ЯКАЯ ГАСПАДЫНЯ, ТАКІ І ПАРАДАК».***

Адказная за выпуск Надзея ДРЫЛА.

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) и стоимость имущества | **ЛОТ № 1.** **Станок сеткоплетельный СПС-2МА-01, заводской номер 0025, дата выпуска 12.2014.** **Первоначальная стоимость – 80 000 000 белорусских рублей.** |
| Собственник (владелец) имущества | ЧТУП «Слававтосити», УНН 391706305 |
| Местонахождение (адрес) имущества | Витебская область, Оршанский район, д. Андреевщина, пер. Парковый, 7 |
| Информация об обременениях | Обременений нет |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Витебск, ул. Правды, 32 27 июля 2015 года в 11.30 |
| Справочная информация | Главное управление юстиции Витебского облисполкома 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 34 Судебный исполнитель Железовский Юрий Александрович, тел./факс 8(0212) 600817 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО «СБ Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, не позднее 26.07.2015. Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |



БелВЭБ

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2015 года

**Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»**

*(в миллионах белорусских рублей )*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | на 01.04.2015 | на 01.04.2014 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 623 930 | 577 671 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 5 078 | 11 598 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 838 683 | 760 949 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 1 253 904 | 1 022 998 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 3 919 260 | 2 237 437 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 19 951 235 | 14 537 834 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | | 13 004 | 15 259 |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 2 636 | 149 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 1 464 612 | 1 161 857 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 6 374 | 6 180 |
| 14 | Деловая репутация | | | - | - |
| 15 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | 327 | - |
| 16 | Прочие активы | 1112 | | 478 723 | 300 635 |
| 17 | ИТОГО активы | 11 | | 28 557 766 | 20 632 567 |
| 18 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 19 | Средства Национального банка | 1201 | | 350 206 | 79 |
| 20 | Средства банков | 1202 | | 13 505 881 | 10 153 465 |
| 21 | Средства клиентов | 1203 | | 10 591 750 | 6 910 962 |
| 22 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 33 058 | 90 362 |
| 23 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | 7 |
| 24 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 25 | Прочие обязательства | 1207 | | 431 113 | 418 281 |
| 26 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 24 912 008 | 17 573 156 |
| 27 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 28 | Уставный фонд | 1211 | | 1 174 075 | 1 174 075 |
| 29 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 30 | Резервный фонд | 1213 | | 420 274 | 369 718 |
| 31 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 684 458 | 617 887 |
| 32 | Накопленная прибыль | 1215 | | 1 341 664 | 868 544 |
| 33 | Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации | | | 3 620 471 | 3 030 224 |
| 34 | Доля неконтролирующих акционеров | | | 25 287 | 29 187 |
| 35 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 3 645 758 | 3 059 411 |
| 36 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 28 557 766 | 20 632 567 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ о прибылях и убытках на 1 апреля 2015 года

**Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»**

*(в миллионах белорусских рублей )*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | на 01.04.2015 | на 01.04.2014 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 810 098 | 571 651 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 493 051 | 250 026 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 317 047 | 321 625 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 188 451 | 152 942 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 55 705 | 77 666 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 132 746 | 75 276 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 2 619 | 936 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 482 | 1 265 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 79 134 | 21 650 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 3 650 | (3 063) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 217 471 | 97 965 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 76 690 | 65 230 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 278 792 | 197 346 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 17 494 | 11 020 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 98 611 | 176 588 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 19 567 | 30 709 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 79 044 | 145 879 |
| 18 | Базовая прибыль на простую акцию | | | - | - |
| 19 | Разводненная прибыль на простую акцию | | | - | - |
| 20 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | | (644) | (145) |
| 21 | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | | - | - |
| 22 | Итого прибыль (убыток) | | | 78 400 | 145 734 |
| 23 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации | | | 87 409 | 136 511 |
| 24 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | | (9 009) | 9 223 |

Председатель Правления Н.В.Лузгин

Главный бухгалтер Л.А.Филиппова

Дата подписания 29 мая 2015 года

Финансовая отчетность размещена на сайте www.belveb.by в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность/ Квартальная финансовая отчетность за 2015 год, составленная в соответствии с законодательством Республики Беларусь».

ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27.12.2013 №6. УНП 100010078.


■ Падзея

# ПЕРШАЯ ЕЎРАПЕЙСКАЯ: ДА СТАРТУ ГАТОВА!

**Заўтра ў Баку распачынаюцца І Еўрапейскія Алімпійскія гульні**



Зборная Беларусі на Еўрагульнях са сваім талісманам Агрыкам.

**Рашэнне аб іх правядзенні было прынята ў снежні 2012 года на 41-й Генеральнай асамблеі еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў. Тады 84 працэнты краін падтрымалі ініцыятыву правядзення спартыўнага турніру. Гульні стануць традыцыйнымі і будуць арганізоўвацца кожныя 4 гады.**

Больш за 6 тысяч атлетаў з 50 краін кантынента на працягу 17 дзён будуць змагацца ў 20 відах спорту, сярод якіх 16 — алімпійскія. У праграму ўключаны таксама баскетбол 3х3, пляжны футбол, самба і каратэ. У 11-ці відах будуць разыграны ліцэнзіі на Алімпіяду-2016. Усяго спартсмены разыграюць 253 камплекты ўзнагарод.



На падрыхтоўку да найбуйнейшага турніру Еўропы ў Азербайджана было ўсяго 2,5 года. За гэты час у Баку пабудавалі алімпійскую вёску і падрыхтавалі чатыры зоны, у якіх пройдуць спаборніцтвы. Яны ўключаюць 18 сучасных спарткомплексаў, 5 з якіх былі пабудаваны з нуля ў самыя кароткія тэрміны. Цырымонія адкрыцця і закрыцця першых Еўрапейскіх гульняў і турніры па лёгкай атлетыцы пройдуць на Нацыянальным стадыёне. Суперсучасны спарткомплекс разлічаны на 68 тысяч чалавек, кошт спортзбудаванняў ацэньваецца ў 500 млн долараў. Дарэчы, агульны бюджэт будаўніцтва спартыўных аб'ектаў для Еўрапейскіх гульняў у Баку склаў каля 950 млн долараў.

Арганізатары стварылі ўнікальныя медалі, над дызайнам якіх працавалі найлепшыя спецыялісты ў супрацоўніцтве з азербайджанскай мастачкай Наргіз Гусейнавай. Афіцыйнымі талісманамі Гульняў сёлета сталі Джэйран (Газель) і Нар (Гранат), якія з'яўляюцца сімвалам выдатнай прыроды і багатай культурнай спадчыны Азербайджана. На думку арганізатараў, такія талісманы адлюстроўваюць вялікае мінулае і шматспадзеўную будучыню краіны.

Зборная Беларусі на Еўрагульнях таксама не застанецца без свайго талісмана. Персанаж Агрык будзе суправаджаць беларусаў на турніры, ён з'яўляецца сімвалам фізічнай сілы і спартыўнага духу.

Ад нашай краіны на першыя Еўрапейскія гульні ў Баку адправіліся 151 спартсмен і 53 трэнеры. Беларусы будуць прадстаўлены ў наступных дысцыплінах: акрабатыка, бокс, барацьба вольная і грэка-рымская, веласпорт (шаша), пляжны валейбол, гімнастыка спартыўная, гімнастыка мастацкая, веславанне на байдарках і каноэ, дзюдо, плаванне, сінхроннае плаванне, скачкі ў ваду, скачкі на батуце, стральба з лука, стральба кулявая, настольны тэніс, трыятлон, фехтаванне, бадмінтон, каратэ, самба, таэквандо.



Першы віцэ-прэзідэнт НАК Беларусі Максім Рыжанкоў напярэдадні адзначыў, што ідэя правядзення Еўрапейскіх гульняў лунала даўно, адным з ініцыятараў увасаблення яе ў жыццё быў прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі.

«Прыемна адзначыць, што ідэя правядзення Еўрапейскіх гульняў у 2011 годзе нарадзілася на пасяджэнні Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў у Мінску, якую падтрымаў прэзідэнт НАК Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Гульні пройдуць у брацкай для нас краіне, і мы сур'ёзна разлічваем на паспяховае выступленне нашых атлетаў у Баку».

Для беларускіх спартсменаў Гульні стануць не проста спаборніцтвамі, а генеральнай рэпетыцыяй перад Алімпіядай у Рыа. У Азербайджан адправіліся як славутыя атлеты-чэмпіёны, так і маладыя спартсмены. Надзеі на медалі звязваюцца найперш з беларускімі прадстаўнікамі ў такіх відах спорту, як грэка-рымская барацьба, мастацкая гімнастыка, веславанне на байдарках і каноэ, кулявая стральба.

Усё гэта аматары спорту змогуць убачыць у прамым эфіры тэлеканалаў «Беларусь 1», «Беларусь 2» і «Беларусь 5»: яны пакажуць трансляцыі гульняў, а таксама самыя яркія моманты спартыўнага форуму. Так, канал «Беларусь 5» прадставіць увазе тэлеаўдыторыі прамыя трансляцыі практычна ўсіх спаборніцтваў Гульняў, у ліку якіх сілавыя віды спорту, веласіпедны спорт і стральба. Акрамя таго, кожны дзень у эфіры канала — спецыяльны праект «Еўрапейскія гульні. Баку-2015. Вынікі дня» і сюжэты з месца падзей. Паўторы найбольш яркіх момантаў спаборніцтваў можна будзе ўбачыць у эфіры тэлеканала «Беларусь 2». Не застанецца без увагі тэлежурналістаў і афіцыйная цырымонія закрыцця Гульняў. 28 чэрвеня яе трансляцыя пачнецца на тэлеканалах «Беларусь 1» і «Беларусь 5» у 18.55.



**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

■ Узровень-40

# СВІТАНКІ НОВАГА ЖЫЦЦЯ ПАД ГУКІ ВЕЧНА МАЛАДОГА ВАЛЬСА...

## У краіне праходзяць апошнія школьныя святы для выпускнікоў

**...Цяпер выпускныя балі ў сярэдніх школах праходзяць па ўсёй краіне ў канцы першай дэкады чэрвеня. Больш за чвэрць стагоддзя таму развітальныя вечары адбываліся на два тыдні пазней — у сярэдзіне 20-х чыслаў. Час бяжыць, усё змяняецца... Як, напрыклад, адносіны настаўнікаў да сваіх колішніх вучняў. Памятаю, недзе першыя гадоў пяць з моманту заканчэння школы мы даволі часта забягалі ў яе — тут яшчэ вучыліся малодшыя браты і сёстры, сябры. І чулі ад настаўнікаў нешта кшталту «Вось раней былі выпускнікі! А вы...» Але пакрысе напал гэтага выказвання сціхаў, пакуль мы аднойчы ўжо не пачулі: «Вось вы — не тое, што цяперашнія школьнікі...» Таму і да гэтых нататак, не жадаючы нікога пакрыўдзіць, прапаную ставіцца гэтак сама. Чалавеку ўласцівае пачуццё настальгіі, калі з цягам часу ў памяці застаецца толькі прыемнае. У наш час выпускнікі не каталіся на лімузінах, не адзначалі свята ў рэстаранах, як гэта стала модным значна пазней, не заказвалі ў якасці вядучых апошняга школьнага балю вядомых шоуменаў — іх папросту не было. Як не было ні шыкоўных сукенак, ні шакаладных фантанаў, ні феерверкаў у гонар заканчэння вучобы. Але, магчыма, прысутнічала нешта такое, пра што не ведаюць, не здагадваюцца выпускнікі сённяшнія...**



Аднакласнікі, настаўнікі, бацькі...



Апошні званок: у адных усё толькі пачынаецца...

ГАВОРАЦЬ, што цяпер тэма выпускнога балю абмяркоўваецца літаральна з пачаткам апошняга для выпускнікоў навучальнага года. У нас такога не было, наколькі памятаю, размовы пра гэта пайшлі ці не ў маі. Вядома, ніякае іншае месца правядзення, як школьная актавая зала для афіцыйнай часткі, а потым сталовая — для неафіцыйнай, нават не разглядалася. У гэтым наша пакаленне падобнае да цяперашніх выпускнікоў, якім таксама дазволена адзначаць свята толькі ў сценах навучальнай установы. Запомнілася, што тады вельмі цяжка было купіць добрыя цукеркі — дэфіцыт тавараў ужо праявіў сябе. А ў мяне маці працавала ў аэрапорце, таму яе папрасілі набыць на ўсіх кілаграмаў пяць шакаладных цукерак, якія я потым аднёс у школу ў невялікім турыстычным заплечніку...

НЕ ведаю адкуль, але была тады ў нас такая традыцыя: пасля апошняга званка, але не пазней выпускнога хадзіць класам на прыроду з начлегам. Я памятаю, як у адзін з апошніх дзён мая мы пасля заняткаў сабраліся на беразе Волмы, каб абмеркаваць наш паход. З невялікага класа ў яго пайшлі амаль усе. Да самага блізкага лесу кіламетры тры ішлі вясёлым натоўпам пад спевы з касетнага магнітафона. Тады ўжо набіраў абароты «Ласкавы май», але не меншай папулярнасцю карыстаўся першы альбом групы «Шакалад», які мы і слухалі бясконца, набліжаючыся да лесу. У ім паставілі палатку без днішча, якая нагадвала індзейскі вігвам, распалілі вогнішча... Рыхтуючы нататкі, я знайшоў старыя здымкі той ночы ў лесе: на іх тагачасная фотатэхніка змагла ў асноўным захаваць толькі гэтае полымя ў ночы. Памятаю, у нас скончылася вада і адзін аднакласнік вызваўся схадзіць да крынічкі. Пайшоў і надоўга знік, думалі, заблудзіў. А потым пілі прынесеную ім ваду з трохлітровага слоіка, у якім на фоне агню былі відаць парушынкі торфу, і ўсё спрабавалі даведацца: аднакласнік дайшоў да крынічкі ці зачарпнуў вады з якой канавы? А таго аднакласніка ўжо няма...

УЖО не першы год падчас правядзення апошніх званкоў і выпускных баляў у краіне дзейнічае забарона на продаж у крамах спіртных напояў. У нашы часы, вядома, таксама нагадвалі, маўляў, каб «ні-ні», але ў крамах нічога не змянялася. Ці прысутнічаў на выпускных алкаголь? Так. Але хутчэй не як уласна спіртное, а як нейкая праява даросласці. Калі мы перад выпускным хадзілі на прыроду, на ўсю кампанію ў нас было дзве бутэлькі віна: у аднакласніка ўжо прайшоў дзень нараджэння, а ў мяне павінен быў быць праз некалькі дзён. Вы думаеце, пры такім раскладзе хаця б нехта захмялеў? На выпускным у нас ужо была гарэлка. Некалькі бутэлек зноў жа на вялікую кампанію. Паколькі ў мяне былі ключы ад фоталабараторыі, паставілі яе менавіта там, і я, каб не прыцягваць увагі, вадзіў па чарзе туды сваіх аднакласнікаў. Ну, каб не прыцягваць увагі... Выходзім раз з чарговым «кліентам» нашага «бара», ён закусвае на хаду. Насустрач — яго маці-настаўніца. Вядома, яна нічога не заўважыла, гэта ж будзённая справа — есці бутэрброд, выходзячы з фоталабараторыі, у той час як побач у школьнай сталоўцы накрытыя сталы, за якімі ўсе сядзяць... Мы ў чайнікі не зазіралі, але па бляску вачэй бацькоў і настаўнікаў было зразумела, што гарбатка ў іх была калі не моцная, дык, прынамсі, паўсалодкая ці салодкая мацаваная... Увесь вечар да самага світання прайшоў без эксцэсаў. Раз ці два ў школу завітаў міліцэйскі патруль, але гэта было планавае наведванне.

ШТО, мабыць, не змянілася за доўгія гады, дык гэта падыходы да выбару строю для выпускнога. Хлопцам было прасцей — дастаткова набыць касцюм, які і потым можна было насіць у паўсядзённым жыцці. Праўда, мой лепшы сябар якраз па гэтай прычыне не збіраўся ісці на апошні школьны вечар, але касцюм быў набыты, і праблема вырашылася. У дзяўчат усё было нашмат складаней, ім заўсёды трэба вырашаць невырашальнае: ісці ў нечым арыгінальным, што потым больш ніколі нікуды не апранеш, або ў больш утылітарным, але не такім адмысловым... Захавалася і стужка выпускніка: ружовая, шырынёй сантыметры на тры, на якой шарыкавай ручкай напісана «Выпускнік-89», побач роспісы той жа ручкай усіх аднакласнікаў і тры значкі на ёй — камсамольскі, «Меткі стралок» і за разрад па стральбе...

ЧЫМ запомніліся апошнія школьныя тыдні? Прадчуваннем хуткіх перамен, якія літаральна адчуваліся ў паветры. Збеглі неяк з лепшым школьным сябрам і суседам па парце Ігарком з заняткаў. Узялі па куфлі квасу, сталі ў цэнтры пасёлка, п'ём і адчуваем, як хмялеем... Ці той квас тады сапраўдны быў, ці то справа была ў іншым... Размовамі пра тое, хто колькі білетаў ужо вывучыў і якую колькасць шпаргалак напісаў. Паходамі на бераг рэчкі зноў жа са школьным сябрам для таго, каб на прыродзе рыхтавацца да іспытаў. Насамрэч карысці ад такой вучобы ў «зялёнай школе» было мала... За колькі часу да выпускнога я зладзіў для аднакласнікаў невялікую фотасесію. За гады вучобы было зроблена шмат фотаздымкаў, гэты былі адны з перадапошніх — на развітанне. Шкада, што нічога не захавалася — усё раздаў. Да апошняга званка, апроч традыцыйнага невялікага фотаальбома, таксама было зроблена адмысловае партфоліа: у канцылярскую карычневую папку для папер за пяць капеек уклеілі па чатыры фота, што я наздымаў на ўроках; аздобілі іх надпісамі «Апошні званок-89» і вершам, надрукаваным на машынцы... Дарэчы, потым колькі гадоў запар я фатаграфаваў на заказ і апошнія званкі ў школах, і выпускныя балі з уручэннем атэстатаў. Была магчымасць нібы зноў і зноў перажываць тое, што яшчэ нядаўна было ў маім жыцці. Збярэш клас і вядзеш куды-небудзь на прыроду: у стары парк, на бераг ракі. І кожны раз спрацоўваў «эфект адной бярозы». Гэта калі прапаноўваў дзяўчыне ці хлопцу або купцы аднакласнікаў сфатаграфавацца, напрыклад, каля якога дрэва. Усё, пакуль увесь клас не сфатаграфуецца па чарзе менавіта каля яго, ніхто нікуды далей не ідзе, іншых бярозак не заўважае!..

ПАДЧАС школьнага жыцця ў мяне былі два захапленні: фатаграфаванне і стральба. Цягам двух гадоў разам з сябрамі выпускалі фотагазету: як ладзіліся суботнікі, праходзілі агляды мастацкай самадзейнасці, праводзіліся спартыўныя спаборніцтвы. Прыемна было ранкам перад урокамі павесіць у фае школы газету, склееную з некалькіх вялікіх аркушаў ватману, і назіраць, як пакрысе да яе ўсе цягнуцца, абмяркоўваюць, смяюцца (і як з кожнай пераменай змяншаецца колькасць здымкаў, якія мае героі адрывалі сабе на памяць). Магчыма, дзякуючы гэтым фотагазетам я і выбраў прафесію журналіста. Памятаю, за некалькі тыдняў да апошняга званка ў школу прыехаў сталічны фотакарэспандэнт рабіць матэрыял на гэтую тэму. Слова за слова (а пра журналістыку я чамусьці ўвогуле не думаў) і ўзнікла цікавасць, якую наталяю ўжо колькі гадоў...

ПЕРАЧЫТАЎ яшчэ раз пажаданні сваіх аднакласнікаў, напісаныя больш за 25 гадоў таму. Часам наіўныя, але вельмі шчырыя. Ці збыліся яны?.. Як і выпускнікам сённяшнім, хочацца верыць, што ва ўсіх нас наперадзе яшчэ шмат світанняў...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота аўтара**

■ Экслібрыс «Звязды»

# ЧЫТАЕМ, ДУМАЕМ, МАЙСТРУЕМ

***Гарбузік: літаратурна-забаўляльны дзіцячы альманах. — Мінск: Кнігазбор, 2015. — 30 с.***




Весела, з прыемнасцю і карысцю бавіць час бацькам разам з дзеткамі дапаможа новы літаратурна-забаўляльны альманах «Гарбузік». Першы яго выпуск з'явіўся вясною; плануецца, што альманах будзе выходзіць двойчы на год.

Гарбузік — гэта не назва гародніны, як можа падацца на першы погляд. Гэта вясёлы і непаседлівы хлопчык, якога прыдумалі бацькі (аўтары тэкстаў і заданняў) для сваіх цікаўных дзетак. Ён дапаможа маленькім чытачам спасцігаць навакольны свет, пазнаёміць з адметнымі старонкамі нашай мінуўшчыны, навучыць ляпіць дыназаўраў з пластыліну і рабіць макеты з кардону, загадае загадкі і раскажа мноства цікавых гісторый.

Чым жа адметны «Гарбузік» і чаму на яго варта звярнуць увагу бацькам, якія гадуюць дзетак? На гэтыя пытанні можа быць адразу некалькі адказаў.

Чытаць «Гарбузік», проста гартаць яго старонкі надзвычай цікава нават даросламу чалавеку. Малюнкі яркія і крэатыўныя, кожны новы разварот па аздабленні і стылістыцы не падобны на папярэдні. Над іх афармленнем працавалі розныя мастакі, кожны з іх выкарыстоўваў уласны падыход да справы, уласнае бачанне вобразаў, герояў. Такі крок цалкам заканамерны. Паводле задумкі ўкладальнікаў, знаёміцца з альманахам дзеткі будуць не адразу, але цягам некалькіх дзён ці вечароў. Так чарговая сустрэча з «Гарбузікам» стане нечаканасцю і нават сюрпрызам. Больш за тое, тэксты, загадкі, заданні, змешчаныя на старонках альманаха, вельмі разнастайныя. Яны адрозніваюцца не толькі жанрам, але і мэтай. Адны проста распавядаюць казачныя гісторыі, іншыя ж стымулююць дзетак на роздум, пошук адказаў на пытанні, дапамагаюць навучыцца і запомніць. Сам хлопчык Гарбузік таксама прысутнічае на старонках альманаха і суправаджае тэксты сваімі «каментарамі-заўвагамі». Гэтыя рэмаркі скіроўваюць думку маленькага чытача, працуюць на карысць утрымання яго ўвагі, а бацькам дапамагаюць зарыентавацца ў методыцы працы з тым ці іншым тэкстам.

Як называюцца пальцы на руцэ і як адрозніць правую руку ад левай? Як запомніць колеры, з якіх складаецца вясёлка, ды і ў цэлым, як утвараецца гэтая з'ява? Як называюць дзіцянят жывёл і чаму назвы некаторых з іх зусім не падобныя да «імёнаў» бацькоў? На гэтыя і многія іншыя пытанні дапаможа адказаць Гарбузік. І зробіць ён гэта не нудна, а весела, з вершамі і малюнкамі.

Мне ж асабліва цікавымі і адметнымі здаліся казкі, змешчаныя ў альманаху. Адна з іх — «Казка пра спадарыню Мышэвіч» Беатрыкс Потэр (з малюнкамі аўтаркі) у перакaзе Алены Байкі. Гэта гісторыя пра мышку Мышэвіч, якая вельмі любіць чысціню. Крыху больш сур'ёзныя казкі Ганны Сілівончык хутчэй скіроўваюць на роздум і развагі. Адна з іх — пра тое, як анёл згубіў крылы і іх знайшлі птушкі, другая — пра кемлівую дзяўчынку Люду, якая выратавалася ад Людажэра.

Беларуска-англійскі вершаваны (і выдатна ілюстраваны Вольгай Раманюк) слоўнічак Алены Церашковай дапаможа дзеткам запомніць некалькі простых англійскіх слоў, а вершыкі «Клапатлівыя машыны» раскажуць пра добрых механічных памочнікаў паштальёнаў, дактароў, пажарных. Распoвед Паліны Грынчанкі пра вожыка Чмыха, які вучыўся збіраць грыбы, дапаможа навучыцца адрозніваць ядомыя грыбы ад ядавітых, а майстар-клас Вольгі Бабурынай навучыць рабіць паштоўкі з выцінанкамі.

Адзначу таксама, што па сваім змесце «Гарбузік» складзены такім чынам, што нібыта прапаноўвае бацькам чаргаваць чытанне (натуральна, разам з дзецьмі) з іншымі відамі дзейнасці: выразаннем, маляваннем, лепкай з пластыліну, разгадваннем рэбусаў і пошукам адказаў на пытанні. Гэта не толькі дапамагае даўжэй утрымліваць увагу дзетак, але і развівае іх творчыя, разумовыя здольнасці, робіць іх больш кемлівымі і адукаванымі.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению Несвижского районного потребительского общества (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества в составе:**

**здание торгового склада**, об. пл. 1307,7 кв.м, инвентарный номер 621/С-20323, расположенное по адресу: **Минская обл., Несвижский р-н, г. Несвиж, ул. Ленинская, 117/1; здание проходной**, об. пл. 23,3 кв.м, инвентарный номер 621/С-20322, расположенное по адресу: **Минская обл., Несвижский р-н, г. Несвиж, ул. Ленинская, 117.**

Земельный участок площадью **0,6517 га** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания торгового склада и проходной.

**Начальная цена с НДС – 2 353 270 080 бел. руб.**

**Задаток в размере 5% от начальной цены перечисляется в белорусских рублях на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Условия оплаты: Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за объект, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) банковских дней после проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

*Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 16.05.2015 г.*

Аукцион состоится **22.06.2015 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.06.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703.**

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-183-69-71.**
**www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

Страховой полис по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу (Балтассистанс) формы РН серии БА № 0356808, 0406466, 0406532, 0506005-0506006, 0507867-0507868, 0507894, 0530654, 0530670, 0530675-0530679, 0530687-0530688, 0530691, 0530693-0530694, 0530697, 0576977, 0576980, 0577024, 0627888, 0627905, 0627908, 0627910, 0627912-0627914, 0627917-0627925, 0628661-0628662, 0628664, 0628666, 0675683-0675686, 0675689, 0675698-0675699, 0675708-0675710, 0675716-0675721, 0675726-0675732, 0675783, 0675793, 0754457, 0754460, 0754465, 0754542, 0754568-0754573, 0754575, 0816689, 0816694, 0829006; квитанции о приеме денежных средств формы 1СУ серии КС № 3590616, 3590682-3590685 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительными в связи с утерей.**

## Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» оказывает услуги по:

• оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование)
• организации и проведению аукционных торгов
• инвентаризации и оценке зеленых насаждений

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 23 июня 2015 в 11.00 состоятся ПОВТОРНЫЕ открытые аукционные торги (торги) по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «ФанДОК» (продавец), в составе:**
**Лот № 1 (предмет торгов): Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-70254 (компрессорное здание), общей площадью 547,7 кв.м, расположенное на земельном участке пл. 0,4303 га по адресу: г. Бобруйск, ул. Ленина, 95/9**

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, ОКПО 55484006, 220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска МФО 153001369 |
| **Продавец предмета торгов** | Открытое акционерное общество «ФанДОК», УНП 700060473 ОКПО 00276624, 213802, г. Бобруйск, ул. Ленина, 95, р/с 3012000000377 в ОАО «Беларусбанк» г. Бобруйска, ул. Горького, 2 филиал 703, код 153801760 |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | ул. Чонгарская, д. 54 , г. Бобруйск, в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» в рабочие дни с 8.30 до 17.30 |
| **Начальная цена продажи** | 1 133 360 000 рублей без учета НДС, задаток 5% – 56 668 000 рублей |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | **Получатель платежа** – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, МФО 153001369, УНП 102353509 |
| **Информация о земельном участке** | Земельный участок с кадастровым номером 741000000006005557 пл. 0,4303 га расположен по адресу: г. Бобруйск, ул. Куйбышева-Ленина. Имущественные права на земельный участок – право постоянного пользования. |
| **Характеристика предмета торгов** | Здание – одноэтажное, стены – кирпичные, ж/б панели, фундамент – ж/бет., перекрытия – ж/бет.; кровля – совмещенная; полы – бетонные, плиточные, имеется электроснабжение, водопровод, канализация, составные части: подвал, здание насосной под артскважиной |
| **Условия продажи предмета торгов** | При заключении договора купли-продажи между продавцом и покупателем (претендентом на покупку) на цену продажи предмета торгов будет начислен НДС по ставке 20% |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов |
| **Сроки и условия оплаты** | Определяются по согласованию победителя торгов (претендента на покупку) с продавцом при заключении договора купли-продажи |
| **Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка** | по 17 июня 2015 г. включительно до 16.00 |

**Победитель (Претендент на покупку)** возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3(трех) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов.

**Более подробная информация об условиях участия в торгах, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Рэспубліка» от 29 января 2015 г.

**Получить доп. информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Белметалл» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом объектов недвижимого имущества,**

## расположенных по адресу: г. Гродно, пер. Победы, 5, в составе:

- Склад, общей площадью 691,6 м.кв., инвентарный номер 400/С-25201;
- Склад (мастерские), общей площадью 921,1 м.кв., инвентарный номер 400/С-25198;
- Навес, общей площадью 294,6 м.кв., инвентарный номер 400/С-25204;
- Склад, общей площадью 696,8 м.кв., инвентарный номер 400/С-25199;
- Навес, общей площадью 122,2 м.кв., инвентарный номер 400/С-43272;
- Производственный корпус, общей площадью 1528,2 м.кв., инвентарный номер 400/С-25202;
- Административное здание, общей площадью 429,1 м.кв., инвентарный номер 400/С-25203;

**в том числе сооружения:**
- Тепловая сеть протяженностью 73,5 м; Наружное ограждение протяженностью 734,95 м; Водопроводная сеть протяженностью 373,10 м; Канализационная сеть протяженностью 251,40 м; Покрытие территории общей площадью 15 911,60 м; Электрическая сеть напряжением 0,4 кВ протяженностью 568,45 м.
- **Зеленые насаждения** (37 шт.), в том числе: тополь – 1 шт., береза – 3 шт., клен – 3 шт., американский клен – 5 шт., яблоня – 6 шт., вишня – 6 шт., слива – 13 шт.

**Начальная цена с НДС 20% – 15 969 730 560 белорусских рублей (снижена на 30%).**

Для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений продавцу на праве постоянного пользования предоставлен земельный участок пл. **2,5008 га**.

*Задаток 10% от начальной цены в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».*

Оплата за предмет аукциона производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, который должен быть подписан в течение **15 (пятнадцати) рабочих дней** после проведения аукциона.

*Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 27.03.2015 г.*

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.** Объекты недвижимости обременены договорами аренды. Ознакомиться с информацией по арендаторам можно у организатора аукциона.

Оплата вознаграждения за организацию и проведение торгов, а также суммы фактических затрат на его проведение осуществляется победителем торгов (покупателем), в порядке предусмотренным соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (Приложение № 3 к Условиям проведения аукциона).

| | |
|---|---|
| **Дата, время и место проведения аукциона:** | **07.07.2015 г. в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 4, ГО «Белресурсы» – управляющая компания холдинга «Белресурсы», 3-ий этаж, актовый зал.** |
| **Срок окончания приема документов для участия в аукционе:** | **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 06.07.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |

**Тел.: +375 17-280-36-37; 8029-183-69-71.**
**www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

УВЕДОМЛЕНИЕ

# ОАО «Амкодор-Белвар»

*220005, г. Минск, проспект Независимости, 58*

## Уведомление кредиторов ОАО «Амкодор-Белвар» об уменьшении уставного фонда Общества и о его новом размере

Внеочередным общим собранием акционеров ОАО «Амкодор-Белвар», которое состоялось 08 июня 2015 г., было принято решение об уменьшении уставного фонда Общества с размера 206 545 813 500 рублей до размера 206 257 805 000 рублей.

Уставный фонд Общества разделен на 2 689 150 простых (обыкновенных) акций номинальной стоимостью 76 700 рублей каждая.

Уменьшение уставного фонда Общества осуществляется путем сокращения общего количества простых (обыкновенных) акций Общества с 2 692 905 штук до 2 689 150 штук за счет 3 755 акций, выкупленных Обществом по требованию его акционеров, подлежащих аннулированию.

*Совет директоров ОАО «Амкодор-Белвар»*

УНП 100363840

## Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» оказывает услуги по:

• оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование)
• организации и проведению аукционных торгов
• инвентаризации и оценке зеленых насаждений

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 24 июня 2015 в 11.00 состоятся ПОВТОРНЫЕ открытые аукционные торги (торги) по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «ФанДОК» (продавец), одним лотом в составе:**

**Лот № 1** (предмет торгов): кап. строение с инв. номером 710/С-66137 (склад для запчастей), общ. пл. 287,9 кв.м; кап. строение с инв. номером 710/С-66135(здание проходной РММ), общ. пл. 33,4 кв.м; кап. строение с инв. номером 710/С-66144 (механическая мастерская), общ. пл. 832,2 кв.м; кап. строение с инв. номером 710/С-66150 (здание для мотопомпы), общ. пл. 19,2 кв.м; кап. строение с инв. номером 710/С-66149 (здание аккумуляторной и вулканизаторной), общ. пл. 109,5 кв.м; кап. строение с инв. номером 710/С-66148 (здание котельной), общ. пл.61,8 кв.м): кап. строение с инв. номером 710/С-66146 (здание заправки), общ. пл. 4,9 кв.м; имеется дорожное покрытие пл. 4493 кв.м, металлические ворота, расположенные на земельном участке пл.3,1840 га по адресу: Могилевская область, Бобруйский район, Брожский с/с, п. Брожа, пер. Станционный, 1А.

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, ОКПО 55484006, 220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, МФО 153001369 |
| **Продавец предмета торгов** | Открытое акционерное общество «ФанДОК», УНП 700060473, ОКПО 00276624, 213802, г. Бобруйск, ул. Ленина, 95, р/с 3012000000377 в ОАО «Беларусбанк» г. Бобруйска, ул. Горького, 2, филиал 703, код 153801760 |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | ул. Чонгарская, д. 54 , г. Бобруйск, в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» в рабочие дни с 8.30 до 17.30 |
| **Начальная цена продажи и размер задатка** | 736 169 695 рублей без учета НДС, задаток 5% – 36 808 500 рублей |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | **Получатель платежа –** Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, МФО 153001369, УНП 102353509 |
| **Информация о земельном участке** | Земельный участок с кадастровым номером 720880800601000402 пл. 3,1840 га расположен по адресу: Могилевская область, Бобруйский район, Брожский с/с, п. Брожа, пер. Станционный, 1А. Имущественные права на земельный участок – право аренды. |
| **Характеристика предмета торгов** | склад для запчастей – одноэтажное здание,1987 г.п., кирпичное, фундамент. – бетон., перекрытия – дерев.; кровля – шифер; полы – бетон.; здание проходной РММ – одноэтажное, 1959 г.п., кирпичное, фундамент. – бетон., перекрытия – дерев., кровля – шифер., полы – дощатые, имеется электроосвещение, отопление; механическая мастерская – здание – одно-, двухэтажное, кирпичное, 1948 г.п., фундамент – бетон., перекрытия – ж/бет.; кровля – совмещенная, полы – бетонные, имеется электроснабжение; здание для мотопомпы – одноэтажное, 1985 г.п., дощатое, фундамент – дерев. столбы, кровля – шифер., полы – дощатые; здание аккумуляторной и вулканизаторной – одноэтажное, 1981 г.п., кирпичное, фундамент – бетон, перекрытия – ж/бет., кровля – совмещенная, полы – бетонные; здание котельной – одноэтажное, 1985 г.п., кирпичное, фундамент – бетон, перекрытия – ж/бет., кровля – совмещенная, полы – бетонные, имеется отопление; здание заправки – одноэтажное, 1987 г.п., кирпичное, фундамент – бетон, перекрытия – дерев., кровля – шифер, полы – дощатые, имеются метал. емкости на кирпич. столбах – 11 шт., 1983 г.п. разных объемов |
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов |
| **Сроки и условия оплаты** | определяются по согласованию победителя торгов (претендента на покупку) с продавцом при заключении договора купли-продажи |
| **Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка** | по 18 июня 2015 г. включительно до 16.00 |

**Победитель (Претендент на покупку)** возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3(трех) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов.

**Более подробная информация об условиях участия в торгах, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Звязда» от 18 апреля 2015 г.

**Получить доп. информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

# Ровенская товарная биржа

**Украина, г. Ровно, ул. Драгоманова, 27**
**+380362620524, +380362620588**

➢ **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА**
➢ **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

## извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества иностранного предприятия «Томашгородский КДЗ»

| Лот | Имущество | Адрес | Начальная цена с НДС, доллары США | Задаток с НДС, доллары США | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| **Лот №1** | Имущество ИП «Томашгородский КДЗ» | Украина, Ровенская обл., Рокитновский р-н, п.г.т. Томашгород, ул. Заводская, 3 | 688 770 | 68 870 (подлежит уплате в гривнах по курсу Нацбанка Украины на дату платежа) | 1 |

**Продавец (собственник) имущества:** Открытое акционерное общество «Дорстройиндустрия» (Республика Беларусь, Минская область, Дзержинский район, город Фаниполь, улица Заводская, 1)
**Организатор аукциона:** Ровенская товарная биржа (договор о проведении аукциона от 04.03.2015)

**С перечнем основных средств, малоценных необоротных материальных активов можно ознакомиться в извещениях, размещенных в газете «Звязда» от 14.03.2015, 11.04.2015, 20.05.2015)**

С информацией о земельном участке, условиями проведения аукциона, порядке и сроках перечисления гарантийного взноса (задатка) можно ознакомиться в извещении, размещенном в газете «Звязда» от 14.03.2015, от 11.04.2015, 20.05.2015)

**Аукцион состоится 07.07.2015 в 11.00 по адресу: ул. Заводская, 1, г. Фаниполь, Дзержинский р-н, Минская обл., Республика Беларусь, 222750. Помещение актового зала ОАО «Дорстройиндустрия».**

Гарантийный взнос (задаток) перечисляется на р/с 26009705953117 в АТ Райффайзен банк «Аваль», г. Ровно, ул. С.Петлюры, 35, МФО 380805. Получатель – Ровенская товарная биржа, код ЄДРПОУ 23302583 (УНП). Назначение платежа: гарантийный взнос для участия в аукционе по продаже имущества иностранного предприятия «Томашгородский КДЗ» (Лот №1), проводимом 07 июля 2015 года.
Окончание приема заявлений и других необходимых документов – 03.07.2015 в 17.00. Заключительная регистрация участников – 07.07.2015 с 09.30 до 11.00 по месту проведения аукциона.

☎ **Организатор: +380362620524, +380362620588 • e-mail: rtb@rivne.com**

# ДОБРА ТАМ, ДЗЕ ЁСЦЬ ПРЫГАЖОСЦЬ

## Шчаслівае і паспяховае грамадства пачынаецца менавіта з гэтага сцвярджэння

**На днях прайшла яркая вечарына надыходзячага лета Fashion Sunday, поўная сюрпрызаў, творчасці, аптымізму, прыгажосці і дзіцячага смеху. Арганізатарам мерапрыемства стала Нінэль Аракелян — кіраўнік праекта Art-Fashion Academy дзіцячага мадэльнага агенцтва MADEMOISELLE ADR`I.**


Дачка Вольгі Плотнікавай.


Усе «зоркі» — разам.

Маленькія выхаванкі агенцтва выглядалі сапраўднымі феямі і прынцэсамі ў рознакаляровых тканінах ад беларускіх дызайнераў. Fashion Sunday стаў своеасаблівым выпускным для маленькіх модніц і моднікаў, якія цэлы год працавалі над дэфіле, стварэннем свайго іміджу і ўменнем пазіраваць для фота- і відэапраектаў.

— Самае каштоўнае — гэта дзіцячыя ўсмешкі. Менавіта шчаслівае дзяцінства, калі бацькі прывучаюць да пачуцця прыгожага з маленства, і ёсць важны ўклад дарослых у будучыню без войнаў і канфліктаў, — упэўнена **госця мерапрыемства, заснавальнік партала prazdnik.by і пераможца конкурсу «Місіс Еўропа — 2014» Алеся КАКОШНІКАВА.** І пацвярджэннем яе слоў было відавочнае задавальненне маленькіх модніках ад удзелу ў дэфіле. Дарэчы, стаць мадэллю агенцтва можна ўжо ў 2,5 года!

Для таго, каб прыцягнуць увагу ў тым ліку да дабрачыннасці, былі запрошаны зоркі беларускай эстрады і іншыя медыйныя персоны. «Разынкай» стала дэфіле з удзелам выхаванцаў агенцтва MADEMOISELLE ADR`I, зорных мам і іх дзяцей.

Спецыяльнай госцяй вечара была арт-фатограф Пола Рубіс. Яна вучылася ў найлепшых майстроў Францыі і Амерыкі, а цяпер упершыню адкрывае Мінск. Сваю філасофію арт-фатограф выказала так: «Імідж наўпрост уплывае на адчуванні чалавека і, адпаведна, гарманізуе яго знутры. На знешнасці не варта зацыклівацца. Аб'ёмы не абавязкова павінны быць 90-60-90. Я, напрыклад, дапамагаю людзям візуалізаваць іх унутраную прыгажосць з дапамогай знешніх сродкаў».

Прыгажосць у любых яе праявах робіць любое грамадства больш добрым і гуманным. У такім грамадстве няма месца агрэсіі, у гэтым упэўнены ўдзельнікі праекта Fashion Sunday.

**Алеся НЕСЦЯРОВІЧ.**

Яшчэ больш фота на www.zviazda.by.

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.38 | 21.41 | 17.03 |
| Віцебск — | 4.19 | 21.38 | 17.19 |
| Магілёў — | 4.28 | 21.31 | 17.03 |
| Гомель — | 4.34 | 21.18 | 16.44 |
| Гродна — | 4.55 | 21.54 | 16.59 |
| Брэст — | 5.05 | 21.45 | 16.40 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 9 чэрвеня. Месяц у сузор'і Авена.*

**Імяніны**

*Пр. Марыі, Фаіны, Івана, Андрэя, Багдана.*
*К. Настассі, Розы, Фелікса.*


Фота Алесі ВАРАБ'ЁВАЙ.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

## 11 ЧЭРВЕНЯ



**1910** год — нарадзіўся Жак Іў Кусто, французскі акіянограф і падарожнік. У гады Другой сусветнай вайны Кусто быў актыўным удзельнікам французскага Супраціўлення, пасля яе заканчэння зноў вярнуўся да сваёй любімай справы — далёкіх падарожжаў і падводнага плавання. У пачатку 1950-х ён набыў і пераабсталяваў для даследчых работ у моры стары брытанскі мінны тральшчык «Каліпса». Здзейсніў на ім мноства акіянаграфічных экспедыцый у Атлантычны, Індыйскі акіяны, Чырвонае, Чорнае, Аравійскае мора і ў Персідскі заліў. Пра вынікі экспедыцый Кусто распавядаў у сваіх кнігах і фільмах. Ён удастоены шматлікіх узнагарод, у тым ліку Ордэна Ганаровага легіёна.

**1903** год — вучоны-славіст, палеограф і этнограф, акадэмік Пецярбургскай акадэміі навук Яўхім Фёдаравіч Карскі распачаў этнаграфічную экспедыцыю па Беларусі, падчас якой было сабрана нямала матэрыялу для даследаванняў і па выніках якой быў выдадзены першы том галоўнай працы навукоўца — «Беларусы», што па праве заслужыла пасля назву «энцыклапедыі беларусазнаўства».

**1931** год — нарадзіўся Уладзімір Аляксандравіч Мацюхін, беларускі вучоны ў галіне фізіялогіі і біяфізікі. Акадэмік НАН Беларусі (1995), доктар медыцынскіх навук (1965), прафесар (1977). Акадэмік АМН СССР (1986), Расійскай АМН (1992). У 1978—1988 гадах — дырэктар Інстытута фізіялогіі Сібірскага аддзялення АМН СССР. У 1988—93 гадах — дырэктар НДІ радыяцыйнай медыцыны Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. З 1994 года — галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута фізіялогіі НАН Беларусі. Навуковыя працы прысвечаны праблемам экалогіі, біёнікі, біярытмалогіі, радыяцыйнай медыцыны. Аўтар больш чым 240 навуковых прац.

**Было сказана**

**Янка СІПАКОЎ, паэт, празаік:**

*Навошта душу*
*Раскрываць гэтак смела,*
*Калі ў той душы*
*Бяздушнасць засела?!.*

## Азбука народнай культуры

**ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч**

ІМЯНІНЫ. Штогадовае свята, якое адзначаецца ў гонар хрысціянскага святога, імя якога далі дзіцяці пры хрышчэнні. Раней імя давалі па святцах — календары ўшанавання святых. Звычайна, дзень імянін супадаў ці быў блізкі да дня нараджэння таму, што дзіця хрысцілі ў перыяд да 40-га дня.

◈ Асаблівае значэнне надавалася першым імянінам. Першы год жыцця дзіцяці вызначаўся як самы важны этап. Менавіта ў першыя імяніны праводзілі абрад пастрыжэння дзіцяці. На патыліцы крыжападобна выстрыгалі дзве пасмы валасоў, якія загортвалі ў тканіну чырвонага колеру і хавалі за абразамі ў чырвоным куце. Лічылася: пакуль валасы дзіцяці ляжаць там, з ім нічога не здарыцца.

◈ Калі сына забіралі ў войска, маці даставала гэтыя валасы і з некалькіх валасінак рабіла амулет («каб дадому вярнуўся»): «закатвала» валасы ў воск грамнічнай свечкі і хавала гэты застылы воск у адзенні сына; астатнія клала назад.

◈ Калі дачка выходзіла замуж, валасы ад першага пастрыгу вымалі і аддавалі ёй назаўжды — «каб стварыла (звіла) сваё гняздо, свой дом, сваю сям'ю і дамоў не вярталася».

◈ У гэты дзень дзіця першы раз падпярэзвалі і апраналі панчохі. Праводзіць усе рытуальныя дзеянні на імянінах дазвалялася хроснай маці або бабулі.

◈ Часам у гэты дзень дзіця аднімалі ад грудзей.

◈ У гэты ж дзень дзіця далучалі да дарослага жыцця, да працы: дзяўчынцы, напрыклад, у рукі першы раз укладвалі кавалак тканіны, хлопчыку — малаток, каб «ён заўсёды ў рабоце быў спрытным».

◈ Абавязковым рытуалам на імянінах было выпяканне караваяў, якія таксама зваліся «імяніннікамі».

## УСМІХНЕМСЯ

**— Я цябе не варты.**
**— Не кажы так. Наогул не смей са мной гаварыць!**

Я дырэктар ламбарда. Таму дару сяброўцы каштоўнасці часта, але часова.

**Бацька распякае сына за дрэнную паспяховасць у школе:**
**— Чаму ў цябе адныя тройкі па ўсіх прадметах, куды ты паступіш?**
**Сын, з крыўдай у голасе:**
**— У мяне па геаграфіі пяць!**
**Бацька:**
**— Значыць, будзеш на заводзе глобусы рабіць!**

Калі тэлевізійнікі задумалі новае шоу — «Секс з зоркамі» — і абтэлефанавалі патэнцыйных удзельнікаў і ўдзельніц, ніхто з іх не сказаў «не». Некаторыя спыталі «з кім?», а большасць — «колькі заплацяць?».

**— Ты чаго з жонкай развёўся?**
**— Ды яна вельмі парадак любіць.**
**— І што такога?**
**— Ды ноччу ўстанеш вады папіць, вернешся, а ложак запраўлены.**


caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.117. Індэкс 63850. Зак. № 2367.
Нумар падпісаны ў 19.30 10 чэрвеня 2015 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12